Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 СТУДЗЕНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 9 (29889)

ФЕСТЫВАЛЬ «БЕРАСЦЕЙСКІЯ САНІ» 5

ШАПАВАЛЫ З ДРЫБІНШЧЫНЫ 12

ЛІЧБА ДНЯ

Больш за 13,5 тысячы

жыхароў Еўрасаюза заехала ў бязвізавым парадку ў нашу краіну з 1 студзеня 2023 года, паведаміў Дзяржаўны пагранічны камітэт. Паводле інфармацыі ведамства, з 1 студзеня ў Беларусь прыбылі 9966 грамадзян Літвы, 1822 грамадзяніна і 462 неграмадзяніна Латвіі, а таксама 1329 грамадзян Польшчы. Усяго з пачатку дзеяння бязвізавага рэжыму для жыхароў суседніх краін ЕС у Беларусь трапілі 398 565 замежнікаў: 258 229 грамадзян Літвы, 27 341 неграмадзянін і 89 956 грамадзян Латвіі, а таксама 23 039 грамадзян Польшчы.

Танк ручной работы

На выхадныя на «Лініі Сталіна» праходзіла чарговая рэканструкцыя падзей Вялікай Айчыннай вайны. Адметная яна была тым, што ў ёй удзельнічала хадавая копія самага масавага ў 30-я гады мінулага стагоддзя савецкага лёгкага танка Т-26.

Падобныя экспанаты на баявым ходу маюць толькі некалькі музеяў за межамі Беларусі. Але наш Т-26 — айчыннай вытворчасці. Бронемашына з'явілася ў адноўленым выглядзе дзякуючы энтузіястам-рэстаўратарам Аляксандру Мікалуцкаму і сям'і Якушавых — спачатку Уладзімір дапамагаў сябру сам, а пасля справай захапіліся і два яго сыны Аляксей і Максім.

«Без перабольшання магу сказаць, што Мікалуцкі і Якушавы — унікальныя спецыялісты, якія «ажывілі» ўжо больш за дваццаць адзінак колішняй тэхнікі», — гаворыць выканаўчы дырэктар гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна» Аляксандр Мятла.

На фота: браты Аляксей і Максім ЯКУШАВЫ каля танка, які яны рэстаўравалі.

Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.

КАРОТКА

- Больш за 25 тысяч пінераў і валанцёраў «Добрага сэрца» ўзялі ўдзел у акцыі «Ад усёй душы».
- **Чырвоны Крыж перадаў бальніцы ў Віцебскім раёне пад'ёмнік для інвалідаў-калясачнікаў.**
- У сталіцы і Мінскім раёне на Вадохрышча абсталююць купелі з падагрэвам.
- **Стартаваў прыём заявак на красавіцкую адукацыйную змену ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку.**
- Выставу традыцыйнага кітайскага жывапісу прадставяць у Нацыянальнай бібліятэцы 19 студзеня.
- **Прадпрыемствы Мінпрама ў студзені — лістападзе 2022 года нарасцілі экспарт у краіны СНД амаль на 40 працэнтаў.**

ISSN 1990 — 763X

Сяўба-2023

РАМОНТНЫ МАРАФОН

Гаспадаркі Гомельшчыны актыўна рыхтуюцца да новага сельгассезона: рабочы працэс на мехдварах і рамонтных майстэрнях кіпіць з пачатку снежня, а ў студзені падрыхтоўка да сяўбы — самы гарачы клопат аграрыяў. Гатоўнасць машынна-трактарнага парка і пасяўных агрэгатаў для сяўбы — на асаблівым кантролі старшыні аблвыканкама Івана КРУПКО. Кіраўнік рэгіёна за мінулы тыдзень даручыў гаспадаркам, якія адстаюць па тэмпах рамонтных работ, тэрмінова выправіць сітуацыю. Як было адзначана, у цэлым да канца студзеня аграрыі плануюць адрамантаваць амаль 870 адзінак тэхнікі, у тым ліку 125 энерганасычаных трактароў.

СТАР. 4

На слыху

КОЛЬКАСЦЬ БЮДЖЭТНЫХ МЕСЦАЎ НЕ СКАРОЦІЦЦА

А магчымасць «перакінуць» дакументы захаваецца

Начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ расказаў, як сёлета зменяцца лічбы прыёму на бюджэт і платную форму навучання ў ВНУ.

«Мы плануем сёлета бюджэтныя лічбы прыёму не скарачаць. Так, будзе карэкціроўка планавых лічбаў у бок павелічэння прыёму недзе ў рэгіянальных ВНУ, недзе паравалічым і ў сталічных на запатрабаваныя спецыяльнасці: медыцынскія, педагагічныя і гэтак далей. Але ў цэлым бюджэтныя лічбы захаваюцца. Па платных пэўная карэкціроўка адбудзецца ў бок змяншэння, таму што тыя вынікі аналізу, якія мы маем за мінулыя гады, сведчаць, што і так планы прыёму на платныя формы не выконваліся. Гэта значыць, пэўная карэкціроўка будзе», — расказаў Сяргей Каспяровіч.

Ён адзначыў, што магчымасць забраць дакументы і паехаць у іншую ВНУ ў выпускнікоў захаваецца і будзе працаваць не горш, чым было раней. «У нас захоўваецца штодзённае з крокам тры гадзіны інфармаванне па балах. Значыць, нічога не пагаршаецца. Інфармаванне таксама будзе ісці і ў апошні дзень прыёму. Ніхто не перашкаджае (наша краіна кампактная) паехаць у іншую ВНУ не толькі ў сталіцы, але і ў любы іншы наш горад, дзе ёсць універсітэт, і падаць дакументы. Тут важна разумець, што выбраны пералік уступных і выпускных са школы не дасць цяпер набор разнастайных прадметаў, што на гэтай стадыі мы ўжо выбіраем не ВНУ, а групу спецыяльнасцяў або прафесію. Так, напрыклад, у БДУ прахадны бал высокі — вышэйшы за 350. Значыць, нішто не перашкаджае, разумеючы, што шанцаў няма, кажучы простай мовай, забраць своечасова дакументы і паехаць у іншую ВНУ. Гэта ўсё будзе працаваць не горш, чым было раней», — расказаў прадстаўнік Мінадукацыі.

БелТА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«БЕЗ ТАКІХ ПАНЯЦЦЯЎ, ЯК МІР І СТВАРЭННЕ, НЕМАГЧЫМЫ ВОБРАЗ БУДУЧЫНІ»

Аб чым гаварыў Аляксандр Лукашэнка на прыёме ад імя Прэзідэнта на стары Новы год

Ужо стала добрай традыцыяй, калі ў гэтае свята, якім нашы продкі распачыналі адлік новага года, у адным месцы збіраюцца прадстаўнікі розных сфер. І не для таго каб вырашыць пэўныя рабочыя пытанні, а проста адпачыць, пагаварыць адзін з адным у неафармальнай абстаноўцы. Сёлета сярод запрошаных на святочны прыём былі вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі дзяржаўных органаў і прадпрыемстваў, журналісты, палітолагі, артысты, спартсмены, прадстаўнікі сілавога блоку, сферы адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны.

Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, гэтым прыёмам з нагоды старога Новага года завяршаюцца зімовыя святы. «Мы сустрэлі, трэба сказаць, гэтыя святы годна і прыгожа, — звярнуўся да ўдзельнікаў прыёму Аляксандр Лукашэнка. — У хатняй утульнасці і цяпле, за святочным сталом, але галоўнае — пад мірным беларускім небам. Традыцыйна дзякую ўсім вам за працу, за вашу пазіцыю, якая ў гэты няпросты час з'яўляецца надзейнай апорай нашай дзяржаве.

Па словах беларускага лідара, на прэзідэнцкі прыём запрошаны людзі, якія паглыблены ў палітычнае жыццё краіны і свету. «Людзі, якія, скажу шчыра, робяць гэтую палітыку і ствараюць гэты свет, — заўважыў ён. — Скажу вельмі канкрэтна: які б нам ні навязвалі інфармацыйны ці іншы парадак дня, сваю палітыку і ўклад жыцця мы, беларусы, заўсёды выбудоўвалі і будзем выбудоўваць выключна самастойна. Ніякія знешнія абставіны і пагрозы не зменяць нашы мэты. Наш выбар — стварэнне».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мы мэтанакіравана ішлі ад Года народнага адзінства да Года гістарычнай памяці, ведаючы, што першае проста немагчыма без другога і наадварот. «Гэтак жа немагчымы і вобраз будучыні — добрай, светлай — без такіх паняццяў, як мір і стварэнне, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Менавіта такім мы хочам бачыць 2023 год — Годам міру і стварэння. І не толькі на сваёй зямлі».

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што сёння гэта разумеюць нават тыя, хто яшчэ ўчора супрацьпастаўляў сябе дзяржаве, выступаў супраць, як яны гавораць, «рэжыму». «А сёння яны бачаць у такім рэжыме сваё выратаванне, — удакладніў ён. — Працэнтаў 90 тых. Я ўжо гаварыў аб гэтым у храме: мы да гэтага гатовы. У якой форме гэта будзе, які шлях яны павінны прайсці назад да сябе дадому — вам вызначаць».

Звяртаючыся да прысутных, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ён сёння абсалютна ўпэўнены ў іх і мільёнах такіх, як яны, сапраўдных патрыётах. «Таму паўтару тое, што сказаў 7 студзеня: гэты год павінен быць абавязкова лепшым, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы гэта паабяцалі людзям».

Падчас прыёму ад імя Прэзідэнта кіраўнік дзяржавы ўручыў узнагароды журналістам і работнікам культуры.

Вераніка КАНЮТА.

Меркаванне дэпутата

Дзеля гістарычнай памяці

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля ТАРАСЕНКА на сустрэчах з моладдзю заўсёды нагадвае пра важнасць захавання гістарычнай памяці, недапушчэнне перапісвання гісторыі, пра неабходнасць ведаць і шанаваць гісторыю роднай краіны. У Год гістарычнай памяці гэтай тэме ў Беларусі надавалася вялікае значэнне. Навошта нам сёння трэба помніць тыя жахлівыя ўрокі Вялікай Айчыннай вайны, якія каштавалі нашай радзіме мільёны жыццяў? Наталля Тарасенка дзеліцца з чытачамі сваімі думкамі на гэты конт.

— У артыкуле 54 нашай Канстытуцыі гаворыцца, што абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца патрыятызм і захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, — кажа яна. — Тэма патрыятычнага выхавання стала сёлета ключавой у рабоце з усімі катэгорыямі грамадзян, але асаблівая ўвага — моладзі.

Цэнтральнае месца ў Год гістарычнай памяці было аддадзена тэме Вялікай Айчыннай вайны. Школам прысвойваліся імёны знакамітых землякоў і герояў, школьнікі вялі актыўную пошукавую работу, вывучалі ўстаноўленыя Генеральнай пракуратурай Беларусі новыя факты генацыду беларускага народа. Па ўсёй краіне ствараюцца ваенна-патрыятычныя клубы, у рабоце якіх задзейнічаны і хлопчыкі, і дзяўчынкі. Усё гэта фарміруе ў моладзі адэкватнае ўспрыманне тых падзей, якія сёння адбываюцца, і прымушае мацней любіць і берагчы сваю радзіму.

У апошнія гады дакладна праявілася тэндэнцыя да адраджэння ў многіх краінах свету ідэалогіі нацызму, правядзення палітыкі апраўдання злачынстваў супраць чалавецтва і чалавечнасці. 16 снежня на пленарным пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН была заслухана рэзалюцыя Расіі «Аб барацьбе з гераізацыяй нацызму, неанацызмам і іншымі відамі практыкі, якія спрыяюць эскалацыі сучасных форм расізму, расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі нецярпімасці».

Гэтая рэзалюцыя падаецца Расійскай Федэрацыяй на разгляд Генеральнай Асамблеі ААН штогод, пачынаючы з 2005 года. Супраць яе заўсёды выказвалася толькі адна краіна — ЗША, але з 2014 года да яе далучылася Украіна, сёлета колькасць такіх краін узрасла да 120. Толькі 50 краін падтрымалі гэтую рэзалюцыю, і 10 устрымаліся. Не прынялі рэзалюцыю ў асноўным тыя краіны, якія ўваходзяць у блок НАТА. Зараз мы назіраем, як адкрыта, не саромеючыся, праводзяць палітыку апраўдання, а фактычна падтрымкі ідэалогіі нацызму і фашызму краіны Еўрасаюза, ЗША, Канада, Японія і іншыя. Ужо звыклымі сталі маршы былых членаў арганізацыі «Вафен СС» і іх сучасных прыхільнікаў па вуліцах прыбалтыйскіх краін, знішчэнне ў Еўропе помнікаў і мемарыялаў савецкім воінам-вызваліцелям, вуліцы ўкраінскіх гарадоў пераймяноўваюцца ў гонар здраднікаў і забойцаў, якія былі асуджаны на знакамітым Нюрнбергскім працэсе. Паўсюдна на тэрыторыі краін Еўрасаюза апаганьваюцца магілы воінаў Чырвонай Арміі.

Урады гэтых краін усімі сіламі імкнуцца выкрасліць з памяці сваіх грамадзян памяць аб самай страшнай вайне ў гісторыі чалавецтва, падвергнуць перагляду вынікі Міжнароднага трыбунала. Няўжо польскі народ забыўся пра печы Асвенціма, а ўкраінцы пра забойствы нявінных людзей у Бабіным Яры? А што кажуць сваім дзецям чэхі пры наведванні Лідзіцы, дзе знаходзіцца мемарыял 82 дзецям, якія былі знішчаны нацыстамі? А дзеянні вызваленчага ад акупантаў партызанскага руху Макі ўжо неактуальныя для французскай моладзі? На гэтым кантрасце наймацней успрымаюцца нашы жалобныя званы Хатыні, маўклівая цішыня спаленых Борак, застылыя ў мемарыялах смутку Ола, Азарычы, Трасцянец, Чырвоны Бераг...

У Год міру і стварэння ўсе, хто жыве на беларускай зямлі, людзі розных нацыянальнасцяў, рознага веравызнання яшчэ раз пацвярджаюць сваю цвёрдую пазіцыю — не дапусціць адраджэння нацызму ў яго розных праявах, не даць магчымасці прыхільнікам палітыкі нацызму, расавай перавагі, ксенафобіі і расізму перапісаць гісторыю, у якой за кожным радком, за кожным словам жыцці знішчаных вайной мільёнаў людзей. Захаванне гістарычнай памяці дзеля міру — велізарная работа ўсяго беларускага грамадства на карысць будучых пакаленняў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Бяспека

Трымаем порах сухім

Беларусь гатовая спыніць любую правакацыю і тэрарыстычную пагрозу, адкуль яна б ні зыходзіла

Аб гэтым заявіў у эфіры тэлеканала СТБ першы намеснік дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Павел Муравейка, каментуючы ўсялякія правакацыі з боку Украіны.

«Да любых правакацыйных дзеянняў з боку Украіны мы гатовыя, — сказаў Павел Муравейка. — Так, сапраўды, на нашых паўднёвых граніцах цяпер не вельмі спакойна. Але, як патрабуе кіраўнік дзяржавы, мы захоўваем вытрымку і цярплівасць, трымаем порах сухім, маем неабходны камплект сіл і сродкаў, якія адрэагуюць на любыя праявы агрэсіўнасці або тэрарыстычнай пагрозы на нашай тэрыторыі».

Першы намеснік дзяржсакратара Савета Бяспекі нагадаў, што ў канцы мінулага года праведзена трэніроўка сістэмы рэагавання на акты тэрарызму. «Гэта было даволі маштабнае мерапрыемства, дзе былі задзейнічаны ўсе сілавыя органы. Яно прайшло на высокім узроўні.

Камандзіры ўсіх падраздзяленняў аб'ектыўна і дакладна разумеюць усе задачы, што на іх ускладаюцца, і ўзровень адказнасці за бяспеку краіны і абарону тых камунікацый, на якія могуць напасці, маюць дакладныя алгарытмы дзеянняў. Байцы падраздзяленняў да аўтаматызму гатовыя адпрацоўваць тыя ці іншыя пытанні», — падкрэсліў ён.

«Мы бачым усе дзеянні, у тым ліку неадэкватныя, калі гэтыя незразумелыя фарміраванні, створаныя на тэрыторыі Украіны, вядуць стральбу ў бок нашай граніцы, усяляк правакуюць. Мы бачым усё, мы ўсё гэта фіксуем. Вядзецца дыялог па лініі пагранічных упаўнаважаных, але, на жаль, ён не заўсёды дае станоўчыя вынікі. Мы размаўлялі па ваеннай лініі, але апошняе таксама, на жаль, пакуль не дае якіх-небудзь вынікаў, — дапоўніў Павел Муравейка. — Мы сёння гатовыя спыніць любую правакацыю і любую тэрарыстычную пагрозу, адкуль яна ні зыходзіла б і якая можа нанесці які-небудзь урон нашай дзяржаве, нашаму народу, нашым людзям».

Выказаўся Павел Муравейка і па некаторых іншых надзённых пытаннях бяспекі.

Аб тэрытарыяльнай абароне

«Калі тэрытарыяльную абарону стваралі, залажылі галоўны прынцып: кожны грамадзянін павінен абараняць сваю Айчыну. Гэта значыць, тэрытарыяльная абарона надае абароне краіны ўсенародны характар, — сказаў Павел Муравейка. — Сёння тэрытарыяльная абарона фарміруецца і ствараецца з тых людзей, якія маюць пэўны жыццёвы досвед, пэўны ўзроставы цэнз. Яны аб'ектыўна ведаюць і разумеюць, што яны будуць абараняць — ім ёсць што губляць. Таму падраздзяленні не проста баяздольныя — яны ўніверсальна гатовыя абараняць свой участак зямлі, свой родны дом, сваю Радзіму».

Паводле яго слоў, вучэнні з удзелам войскаў тэрытарыяльнай абароны праходзяць для таго, каб павысіць навыкі. «Успомніць спосабы абыходжання са зброяй, адпрацаваць новыя прыёмы і варыянты, як гэта робіцца ў сучасных войнах, — дапоўніў першы намеснік дзяржсакратара Савета Бяспекі. — Магу сказаць адназначна: такія вучэнні праводзіліся і будуць праводзіцца. І, дарэчы, найбліжэйшае — ужо ў першым квартале бягучага года. Мы зноў паклічам дарослае пакаленне для таго, каб яно паўдзельнічала ў пытаннях тэрытарыяльнай абароны. На сёння гэтыя падраздзяленні гатовыя. Прычым не толькі фізічна, але і маральна, духоўна, і матываваныя, што Радзіму сваю яны нікому не аддадуць».

Аб вучэннях АДКБ

«З чатырох вучэнняў, якія штогод праводзіць арганізацыя, тры плануецца правесці на тэрыторыі нашай краіны. Гэта вучэнне «Узаемадзеянне» Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання, вучэнне «Пошук» разведвальных падраздзяленняў і вучэнне «Эшалон» — тылавых. Гэта ўсё пройдзе на тэрыторыі нашай краіны ў верасні. Вялікі віток атрымае развіццё інфармацыйна-аналітычнага складніка, бо хто валодае інфармацыяй, той валодае светам. На гэтым зроблены ўпор, і гэта таксама адносіцца да аднаго з прыярытэтаў нашага старшынства».

Аб узроўні кіберзлачыннасці

Першы намеснік дзяржсакратара Савета Бяспекі, спасылаючыся на МУС, расказаў, што ў 2022 годзе ўзровень кіберзлачыннасці знізіўся амаль на 12 працэнтаў. «Гэта не ад таго, што злачынцаў стала менш, гэта мы сталі працаваць больш эфектыўна, — падкрэсліў ён. — Дадзенае пытанне пастаянна знаходзіцца ў полі зроку ўсіх сілавых структур. Яны актыўна ўдзельнічаюць у барацьбе з усімі праявамі. Больш за тое, па гэтым пытанні ідзе актыўнае міжнароднае супрацоўніцтва. Літаральна некалькі дзён таму дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, сустракаючыся з нашым Прэзідэнтам, абазначыў, што на Вышэйшы дзяржаўны савет для зацвярджэння кіраўнікамі дзяржаў (гэта значыць органам Саюзнай дзяржавы) выносіцца канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Саюзнай дзяржавы. Мы сумесна з нашым стратэгічным саюзнікам вырашаем задачы, як гэтаму супрацьдзейнічаць».

Дата

Краіна моцная рэгіёнамі

15 студзеня чатыры беларускія рэгіёны – Віцебская, Гомельская, Магілёўская і Мінская вобласці адзначылі 85-годдзе. Менавіта ў гэты дзень далёкага 1938 года на першай сесіі Вярхоўнага Савета СССР было прынята рашэнне аб іх стварэнні. Са знакавай датай жыхароў абласцей павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. А ў саміх рэгіёнах пад знакам слаўнага юбілею пройдзе ўвесь гэты год.

Нібы ніткі найпрыгажэйшага ўзору

Старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр ТУРЧЫН у сваім віншаванні жыхарам вобласці адзначыў, што, падводзячы вынік 85-гадовага перыяду, можна з упэўненасцю канстатаваць: усім ёсць чым ганарыцца.

«Гісторыя вобласці багатая на розныя падзеі, у аснове якіх — лёсы людзей. Мы заўсёды памятаем пра працоўныя подзвігі першых шахцёраў і будаўнікоў, якія стваралі сучасны Салігорск. Захапляемся талентам канструктараў, чыя адважная думка ўвасобілася ў найбуйнейшых у свеце самазвалах. З павагай ставімся да сялян, якія ў далёкія даваенныя гады закладвалі слаўныя традыцыі тэхналагічнага аграпрамысловага комплексу. Дзякуем настаўнікам, медыкам, работнікам культуры, сацыяльнай абароны, спартсменам і шматлікім іншым прафесіяналам сваёй справы, чыя штодзённая праца, як ніткі слуцкага пояса, уплеценая ў агульны вынік, які дасягнуты вобласцю!» — гаворыцца ў віншаванні кіраўніка рэгіёна.

Аляксандр Турчын нагадаў пра гераізм землякоў, ахвяры ваеннага ліхалецця, працоўны подзвіг пасляваеннага пакалення.

«Мінская вобласць сёння — гэта ўпэўнены лідар! — заявіў ён. — Мы ўмеем працаваць і, галоўнае, зарабляць! Мы будуем жыллё, узводзім дзіцячыя садкі, школы, паліклінікі, запускаем новыя вытворчасці, укладаем сродкі ў спартыўныя і культурныя аб'екты. Змяняем да лепшага буйныя гарады і малыя раённыя цэнтры, пасёлкі, рэканструіруем і пашыраем транспартныя артэрыі вобласці і краіны».

Усё гэта падпарадкавана адной мэце — зрабіць жыццё чалавека камфортным і бяспечным, напоўніць дамы шчаслівым дзіцячым смехам, а сямейны стол — шчодрым пачастункам, падсумаваў губернатар. Ён пажадаў усім міру, шчасця і дабрабыту, моцнага здароўя, энергіі і жыццёвых сіл.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Пункты росту і каштоўныя рэзервы

Гомельская вобласць — найбуйнейшая па тэрыторыі вобласць Беларусі. Жыхары рэгіёна — гэта 15 працэнтаў насельніцтва нашай краіны. Сёння на Гомельшчыне пражывае звыш 1 мільёна 350 тысяч чалавек. Гомельская вобласць — гэта высокаразвіты індустрыяльны рэгіён. Вобласць валодае значным экспартным патэнцыялам. Больш за палову прадукцыі, што вырабляецца ў рэгіёне, пастаўляецца на экспарт. За эканамічнымі паказчыкамі, як вядома, — якасць жыцця людзей, развіццё горада і вёскі, работа сістэм аховы здароўя, адукацыі, культуры.

«Гэты юбілей увасабляе ўрачыстасць здзяйсненняў і добрых спраў на карысць роднай зямлі, дазваляе ў поўнай меры адчуць гонар за вынікі працы многіх пакаленняў людзей», — адзначыў у сваім віншаванні жыхароў Гомельскай вобласці з 85-годдзем з дня ўтварэння рэгіёна **старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО.**

У летапісе Гомельскай вобласці шмат унікальных старонак, нагадаў кіраўнік рэгіёна. Іван Крупко зрабіў акцэнт на тым, што за восем з паловай дзесяцігоддзяў жыхары Гомельшчыны ўнеслі дастойны ўклад ва ўмацаванне патэнцыялу рэгіёна і ўсёй краіны.

«Сёння Гомельшчына — край высокаразвітой прамысловасці, унікальнай прыроды, працавітых і таленавітых людзей», — падкрэсліў старшыня аблвыканкама.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Без пятнаццаці век!

Віцебшчына таксама святкуе 85-гадовы юбілей. Пад святочным знакам у паўночным рэгіёне на працягу года пройдзе шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да юбілею.

«У паўночным рэгіёне ўвасоблены асноўныя рысы беларускага народа: гасціннасць, шчодрасць, міралюбнасць, тут адчуваецца жыватворная сіла нацыянальна-вызваленчага руху. Жыхары Віцебскай вобласці заўсёды былі дастойнымі працаўнікамі і абаронцамі Айчыны, славілі свой край мірнымі і ратнымі справамі. Больш за 300 Герояў Савецкага Саюза, Герояў Сацыялістычнай Працы, Герояў Беларусі, Герояў Расійскай Федэрацыі і поўных кавалераў ордэнаў Славы і Працоўнай Славы ўзрасціла Віцебская зямля. У Віцебшчыны велізарны патэнцыял і шырокія перспектывы, рэгіён напоўнены стварэннем і творчым пошукам, адкрывае вялікія магчымасці для развіцця і росту. Нараджаюцца новыя планы і знаходзяць увасабленне самыя смелыя ідэі — і ўсё гэта дзякуючы людзям, якія працуюць тут, іх таленту і працавітасці. Упэўнены, што і далей жыхары Віцебскай вобласці будуць уносіць дастойны ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Беларусі, спрыяць яе далейшаму ўмацаванню. Няхай добрая слава і традыцыі рэгіёна прымнажаюцца новымі справамі і здзяйсненнямі», — павіншаваў жыхароў рэгіёна старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін.

Добрай традыцыяй напярэдадні знакавых падзей стала адкрыццё новых сацыяльна значных аб'ектаў. Старт святочным мерапрыемствам, прымеркаваным да 85-годдзя вобласці, дало адкрыццё новага корпуса ў дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Жамчужына» Лепельскага раёна.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Дурноў напярэдадні юбілею расказаў, што святочныя мерапрыемствы ў паўночным рэгіёне пройдуць на працягу года. Цэнтральнай падзеяй юбілейнага года стане ўшанаванне ўладальнікаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны». Разам з перадавікамі героямі ўрачыстасці стануць і ветэраны, якія залажылі аснову сучаснага развіцця Віцебшчыны», — падкрэсліў Вячаслаў Віктаравіч.

Цыкл мерапрыемстваў будзе звязаны з імем славутага ўраджэнца Віцебшчыны Пятра Міронавіча Машэрава і прысвечаны 105-годдзю з дня нараджэння дзяржаўнага і палітычнага дзеяча. Іх правядзеннем зоймецца некалькі арганізацый, а ініцыятарам і галоўным арганізатарам выступіць Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт, які носіць яго імя.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Прырода, традыцыі, дасягненні

Магілёўская вобласць у 85-гадовы юбілей — гэта 21 раён, мільён жыхароў, больш чым 1600 прадпрыемстваў. Асаблівым гонарам Прыдняпроўскага краю заўжды былі людзі. 114 ураджэнцаў Магілёўскай вобласці сталі Героямі Савецкага Саюза, 23 — поўнымі кавалерамі ордэна Славы. Генерал Іосіф Гусакоўскі, гвардыі палкоўнік Сцяпан Шутаў, генерал-маёр Іван Якубоўскі двойчы ўдастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

За працоўныя дасягненні больш за 100 ураджэнцаў вобласці стала Героямі Сацыялістычнай Працы. Ураджэнец Бялыніцкага раёна Васіль Старавойтаў атрымаў такое ганаровае званне двойчы. Старшыня легендарнага калгаса «Світанак» Кіраўскага раёна Кірыл Арлоўскі за свае баявыя і працоўныя подзвігі адзначаны зоркамі Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы.

«Магілёўшчына — наша родная зямля, дзе мірна жывуць і працуюць прадстаўнікі розных узростаў і прафесій, рэлігій і поглядаў, — адзначыў у сваім віншаванні **старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Анатоль ІСАЧАНКА.** — У яе ўклалі шмат намаганняў нашы паважаныя ветэраны, прадстаўнікі старэйшага пакалення. Сённяшняя наша задача — не толькі захаваць, але і прымножыць патэнцыял, створаны папярэднімі пакаленнямі, і, безумоўна, зберагчы для нашых дзяцей і ўнукаў. Мы па праву ганарымся багатай гісторыяй нашага рэгіёна, дзівоснай прыродай, традыцыямі, магутнай прамысловасцю, навукова-тэхнічнай базай, развітой сельскай гаспадаркай».

Адсачыць працэс гістарычнага развіцця вобласці і пазнаёміцца з яе мінулым і сучаснасцю можна будзе падчас выставы «Гістарычны летапіс. 85-годдзю ўтварэння Магілёўскай вобласці прысвячаецца...», якая пройдзе ў Палацы культуры вобласці з 17 да 20 студзеня.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Надвор'е

«Вось і цёпленькая пайшла...»

Сапраўдная адліга — гэта калі да плюс 10 градусаў

Ну і што, што на дварэ разгар зімы — сярэднясутачная тэмпература паветра на 1—7 градусаў перавышае кліматычную норму. Ападкі ідуць у асноўным у выглядзе мокрага снегу і дажджу. А на працягу тыдня нас чакаюць туман, галалёдзіца і ўпэўнены «плюс», у сераду — да 9 цяпла. Праўда, снежнае покрыва растае пакуль вельмі неахвотна, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Найбольш цёплы дзень за тыдзень чакаецца менавіта ў сераду. Пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах будзе назірацца слабы туман і галалёд, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад мінус 2 градусаў да плюс 4, а ўдзень ад плюс 1 да 7 цяпла. На поўдні краіны слупок тэрмометра паднімецца да плюс 9 градусаў.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі нашай краіны прагназуюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд, ноччу і раніцай на дарогах галалёдзіца. Начная тэмпература паветра будзе ў межах ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, а дзённая — ад 0 да плюс 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны будуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу панізіцца да мінус 3 — плюс 3 градусаў. Удзень чакаецца мінус 2 — плюс 4 градусы. Па паўднёвым усходзе краіны ноччу будзе 4—5 градусаў вышэй за нуль, а днём 5—8 цяпла.

Мокры снег з дажджом чакаецца ў суботу. У асобных раёнах слабы туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, а днём па паўднёвым усходзе — 6 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Глабальная шкода ад стыхійных бедстваў склала каля $270 млрд

Сукупная шкода сусветнай эканомікі ад стыхійных бедстваў летась скарацілася прыкладна на 15 працэнтаў у параўнанні з 2021 годам і склала каля $270 млрд супраць $320 млрд, сведчаць папярэднія даныя нямецкай Munich Re, найбуйнейшай перастраховачнай кампаніі свету. Самай разбуральнай падзеяй мінулага года стаў ураган «Іэн», які ў верасні абрынуўся на ўзбярэжжа Фларыды. Эканамічныя страты ў выніку дасягнулі $100 млрд. Па памеры ўрону з улікам інфляцыі «Іэн» займае другое месца ў гісторыі, саступаючы толькі ўрагану «Катрына» 2005 года. На другім месцы — паводка ў Пакістане, выкліканая рэкорднымі па аб'ёме ападкаў мусонамі. Яе ахвярамі стала каля 1,7 тысячы чалавек, а прамая шкода склала не менш чым $15 млрд. «Аналізуючы даныя за 2022 год, трэба памятаць пра два ключавыя фактары. Па-першае, феномен Ла-Нінья назіраецца трэці год запар, што павялічвае верагоднасць ураганаў у Паўночнай Амерыцы, паводак у Аўстраліі, засухі і спякоты ў Кітаі, а таксама значных мусонаў у асобных рэгіёнах Паўднёвай Азіі. Акрамя таго, з-за змены клімату сталі часцей фіксавацца экстрэмальныя ўмовы надвор'я. Часам гэтыя фактары накладваюцца адзін на аднаго», — напісаў галоўны спецыяліст па клімаце ў Munich Re Эрнст Раух.

Пераважная большасць еўрапейцаў занепакоена ростам кошту жыцця

Рост кошту жыцця з'яўляецца самай сур'ёзнай праблемай для 93 працэнтаў еўрапейцаў, вынікае з апытання грамадскай думкі, праведзенага для Еўрапейскага парламента (ЕП). «Людзі са зразумелых прычын занепакоеныя ростам кошту жыцця, паколькі ўсё больш і больш сем'яў спрабуе звесці канцы з канцамі», — заявіла старшыня ЕП Раберта Метсола. «У кожнай дзяржаве ЕС больш за сем з дзесяці рэспандэнтаў занепакоена ростам кошту жыцця пры найбольш высокіх паказчыках у Грэцыі (100 %), на Кіпры (99 %), у Італіі і Партугаліі (па 98 %)», — паведаміла прэс-служба Еўрапарламента па выніках апытання. Другой найбольш значнай занепакоенасцю еўрапейцаў (для 82 працэнтаў апытаных) з'яўляецца пагроза беднасці і сацыяльнай ізаляцыі.

Дзясяткі тысяч медыкаў у Мадрыдзе выйшлі на акцыю пратэсту

Дзясяткі тысяч медыцынскіх работнікаў выйшлі на вуліцы Мадрыда ў знак пратэсту супраць скарачэння фінансавання сферы аховы здароўя рэгіянальным урадам, паведаміў Euronews. Адзначаецца, што ў акцыі ўзяло ўдзел каля 30 тыс. чалавек. Многія пратэстоўцы скандзіравалі, што ўразанне фінансавання грамадскай аховы здароўя з'яўляецца злачынствам. Па словах удзельнікаў маніфестацыі, нягледзячы на тое, што Мадрыд з'яўляецца сталіцай краіны і адным з яе найбагацейшых рэгіёнаў, выдаткі на ахову здароўя на душу насельніцтва тут з'яўляюцца аднымі з самых нізкіх у краіне. Рэгіянальны ўрад Мадрыда на чале з Ісабель Дыяс Аюса ў апошнія некалькі гадоў, асабліва пасля пачатку пандэміі каранавіруса, неаднойчы рэзка крытыкаваўся за дрэннае ўкамплектаванне персаналам бальніц і цэнтраў аказання першаснай медыка-санітарнай дапамогі. Летась у лістападзе дзясяткі тысяч людзей прайшлі маршам па цэнтры іспанскай сталіцы ў падтрымку работнікаў аховы здароўя, якія патрабуюць паляпшэння ўмоў працы.

Ад усёй душы

З КЛОПАТАМ ПРА КОЖНАГА

Дом самастойнага пражывання «Расінка» з'явіўся на тэрыторыі Чавускага псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў у 2021 годзе. З дапамогай ірландскай дабрачыннай арганізацыі пад яго быў перароблены былі адміністрацыйны будынак. Ён разлічаны на 18 чалавек, пакуль тут жывуць восем. Пяцёра ўжо адноўлены ў дзеяздольнасці, трое праходзяць сацыялізацыю. Гэта людзі, якія дзякуючы сваёй упартасці і працаздольнасці даказалі, што могуць несці адказнасць перад грамадствам нараўне з усімі.

У рамках акцыі «Ад усёй душы» на стары Новы год дом самастойнага пражывання наведалі **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА, намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Вераніка ДЗЯМІДАВА і старшыня праўлення Магілёўскага абласнога аддзялення Фонду міру Андрэй НІКІЦІН.**

Тое, што тут рады гасцям, было відаць па тварах жыхароў «Расінкі». Маладыя людзі, якія з прычыны розных хвароб страцілі дзеяздольнасць, а цяпер зноў становяцца паўнавартаснымі грамадзянамі краіны, віталі на парозе. Усе апранутыя ў белыя фуфайкі з гаворачымі надпісамі. «Выконваць дамашнія справы», «Магчымасць свабодна перасоўвацца», «Ні ад каго не залежаць» — гэта не проста мерч , а стымул для жыцця. Шчырыя прывітальныя словы, віншаванкі, абмен падарункамі... Валерый Малашка павіншаваў моладзь ад імя кіраўніцтва вобласці, нагадаўшы, што дзяржава не забываецца пра іх, што шмат рэсурсаў накіроўвае на тое, каб яны маглі аднавіць сябе ў правах. І акцыя «Ад усёй душы» — таксама адна з формаў клопату дзяржавы.

У кожнага жыхара «Расінкі» свой шлях сюды. Некалькі чалавек прыбыло з Веснаўскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Адзін з іх — 32-гадовы Саша Пестаў.

ДА ВЕДАМА

Чавускі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў разлічаны на 320 чалавек, сёння там пражываюць 317 грамадзян ва ўзросце ад 18 да 89 гадоў. 120 з іх — людзі да 45 гадоў.

— Ён ужо атрымаў рэкамендацыі для працоўнай дзейнасці і дапамагае нам па гаспадарцы, — удакладняе **дырэктар дома-інтэрната Таццяна ВАЯВОДАВА.** — Мае працоўную кніжку і ўжо два месяцы як атрымлівае зарплату. Працалюбівы хлопец радуецца, што атрымаў магчымасць дапамагаць дзяржаве і зарабляць грошы.

Тым, хто жыве звычайным жыццём, няўцям, якім багаццем, па сутнасці, валодае здаровы чалавек. Тое, што для яго лёгка, — сапраўдны подзвіг для жыхара дома-інтэрната. Аляксандр Лёўкін і Насця Сівакова — інваліды-калясачнікі, кожны рух ім даецца з цяжкасцю. У Насі слабыя рукі, яна выдатна збірае пазлы, але мала хто верыў, што дзяўчына асвоіць тэхніку алмазнай вышыўкі. Насця прымусіла свае непаслухмяныя пальцы трымаць маленькія стразы. І як толькі тое атрымалася, адразу ж паслала дырэктару дома-інтэрната відэа, якое зафіксавала яе перамогу.

Саша робіць прыгожыя жыццесцвярджальныя карціны. Ён падрыхтаваў падарункі для кожнага з гасцей. Калі Саша расказвае, як праходзіў праграму для атрымання права быць дзеяздольным, пачынае хвалявацца: «Гэта вельмі цяжка. Але мы паставілі мэту — пераадолець сябе і даказаць, што можам жыць самастойна. Для мяне вельмі важна стаць дзеяздольным. Цяпер я маю права голасу і магу браць удзел у жыцці краіны. Я — патрыёт сваёй Радзімы».

У «Расінцы» цёпла і ўтульна, ёсць усё неабходнае для камфортнага жыцця. На першым паверсе пральня, кухня, сталовая. На другім — пакоі для пражывання і сумеснага баўлення часу. Чысціню жыхары падтрымліваюць самастойна, у кожнага свая зона адказнасці, дзяжурства па графіку. З імі працуюць спецыялісты, дапамагаюць знайсці захапленне, работу даспадобы.

Тамара Странакова, напрыклад, даглядае цялят. Расказвае, што спачатку жыла ў дзіцячым доме, потым у спецшколе ў Расне, адтуль трапіла ў Веснава, а цяпер вось тут. І ёй падабаецца. Яна сама сабе гаспадыня, у яе ёсць асобны пакой — светлы і ўтульны. На сцяне шмат фота. Вось Тамара з сястрой у Каменскім доме-інтэрнаце, на яшчэ адным яна ўжо ў «Расінцы», прымярае вобраз Снягуркі. А вунь на тым — разам з сяброўкай сервіруе сталы да свята.

Характары насельнікаў дома самастойнага пражывання ва ўсіх розныя, здольнасці — таксама. Тамара Странакова — прыроджаны лідар, Саша Пестаў — гаспадарлівы, Святлана Мішчаненка творча ўпрыгожыла вокны выцінанкай...

Дамы самастойнага пражывання — вельмі перспектыўная форма, якая сёння актыўна прасоўваецца на Магілёўшчыне. Летась дом, падобны на Чавускі, адкрыўся пры Каменскім доме-інтэрнаце ў Бабруйскім раёне. А першай ластаўкай стаў Веснаўскі дом-інтэрнат, дзе падобныя дамы пачалі функцыянаваць яшчэ ў 2009 годзе.

— Мне прыемна быць тут у гасцях, — прызнаўся Валерый Малашка. — І вялікі дзякуй работнікам інтэрната за тую работу, якую яны робяць. Дзяржава стварыла цудоўныя ўмовы, каб людзі маглі тут жыць і развівацца. Я рады, што маладыя людзі сталі самастойнымі.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.
Чавускі раён.

Кампетэнтна

Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Вераніка Дзямідава:

— У вобласці жыве амаль 15 тысяч адзінокіх людзей, у дамах-інтэрнатах — болей чым 2100 непрацаздольных грамадзян. У навагоднія дні для іх былі арганізаваны больш чым 150 розных мерапрыемстваў. Акцыя «Ад усёй душы» своеасаблівая. Цудоўна, калі маладыя людзі прыходзяць да пажылых, інвалідаў, людзей з фізічнымі абмежаваннямі і кажуць ім добрыя словы. Гэта абавязкова застанецца ў памяці і моладзі, і тых, да каго яны прыходзілі. Для апошніх гэта наогул вялікая радасць і добры настрой.

РАМОНТНЫ МАРАФОН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Гомельскім раёне падрыхтоўку тэхнікі і сельгасагрэгатаў актыўна вядзе адна з найбуйнейшых мясцовых гаспадарак ААТ «Птушкафабрыка «Расвет». Тут на захоўванне свой «палявы» парк паставілі позняй восенню, калі скончыліся апошнія работы на зямлі. І ўжо ў студзені пачалася падрыхтоўка да будучага сезона: бягучы рамонт, тэхабслугоўванне, наладка вузлоў. Асноўная тэхніка і сельгасагрэгаты гаспадаркі, што задзейнічаны ў палявых работах, размяшчаюцца ў двух машынна-трактарных парках у Клімаўцы і Грабаўцы.

Інжынер-механік аддзялення «Грабаўка» Сяргей ГАЦАНАЎ тлумачыць, што аб'ём рамонтных і падрыхтоўчых работ традыцыйна значны.

— Асаблівая ўвага не толькі сельгасмашынам, але і глебаапрацоўчым і пасяўным агрэгатам, сеялкам, плугам, дыскатарам, культыватарам. Задзейнічаны непасрэдна толькі на рамонце майстар-наладчык і слесар. Трактарысты-машыністы, якія не занятыя на вывазцы арганікі, падвозе кармоў, таксама дапамагаюць у майстэрнях: рамантуюць тэхніку

і агрэгаты, на якіх пазней і будуць выходзіць у поле, — дадае інжынер-механік.

У гэтым аддзяленні гаспадаркі няма асобных спецыялістаў зваршчыка і токара, але гэтыя работы пры неабходнасці аператыўна выконваюць у цэнтральным аддзяленні гаспадаркі ў Пясочнай Будзе.

Сяргей Гацанаў адзначае адказную работу ўсіх супрацоўнікаў, што рамантуюць і рыхтуюць тэхніку. У рамонтнай зоне механізатараў, кажа, ёсць і асаблівы гонар іх калектыву: майстар-наладчык з самым вялікім вопытам работы ў аддзяленні — Міхаіл Махаленка.

— Тэрмін устаноўкі глебаапрацоўчай тэхнікі і пасяўных агрэгатаў на лінейку гатоўнасці — першага сакавіка. Але ў аддзяленні свае ўнутраныя графікі. Працуем цяпер на рамонце з васьмі раніцы да пяці вечара. Увогуле, ёсць жаданне працаваць за добры вынік, — дзеляцца супрацоўнікі «Грабаўкі».

У вытворчым аддзяленні гаспадаркі на асаблівым кантролі забеспячэнне неабходных умоў працы падчас работ у майстэрні. Пры паніжэнні тэмпературы паветра ў рамонтнай зоне карэкціруюць графік працы: уводзяцца дадатковыя перапынкі для адпачынку і абагрэву работнікаў.

— У пакоі адпачынку ёсць гарачае водазабеспячэнне. Работнікі, што задзейнічаны на рамонце, цалкам забяспечаны цёплым спецадзеннем і абуткам, — падкрэслівае Сяргей Гацанаў.

Увогуле, у гаспадарцы большую частку рамонтных работ імкнуцца выконваць сваімі сіламі — кожны механізатар, адпрацаваўшы сезон, ужо ведае, што трэба выправіць і адрамантаваць.

— Акрамя таго, у нас працуюць слесары, якія дапамагаюць рамантаваць тэхніку, замацаваную за механізатарамі, — звяртае ўвагу **галоўны інжынер ААТ «Птушкафабрыка «Расвет» Сяргей ПАРУКАЎ.**

Па яго словах, у новым сельгассезоне гаспадарцы неабходна выставіць на лінейку гатоўнасці каля 30 адзінак культыватараў, прэсаў, дыскатараў і іншых сельгасагрэгатаў. Стаіць задача правесці дыягностыку і завяршыць бягучы рамонт амаль паўсотні трактароў. У гэтым годзе машынна-трактарны парк сельгаспрадпрыемства папоўніцца новай тэхнікай — трактарамі «Беларус» і «Амкадор».

Актыўная падрыхтоўка машынна-трактарнага парка і пасяўных агрэгатаў да новага сельгассезона працягваецца ва ўсіх гаспадарках рэгіёна. Старшыня аблвыканкама Іван Крупко паставіў задачу ўзмацніць кантроль за выкананнем графіка рамонту тэхнікі як з боку камітэта па сельскай гаспадарцы, так і з боку старшынь райвыканкамаў.

Як адзначыў на апаратнай нарадзе ў Гомельскім аблвыканкаме **старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Дзмітрый ПЕТРАЖЫЦКІ,** на 16 студзеня ў вобласці адрамантавана сельгастэхнікі амаль 60 працэнтаў ад запланаванага на гэты месяц. У цэлым да канца студзеня гаспадаркам рэгіёна трэба адрамантаваць яшчэ 352 адзінкі тэхнікі. Асаблівую ўвагу рамонту неабходна ўдзяліць аграрыям Веткаўскага, Добрушскага, Жыткавіцкага, Кармянскага і Лельчыцкага раёнаў, на якія прыпадае 59 працэнтаў тэхнікі, што падлягае рамонту да пачатку лютага.

Наталля КАПРЫЛЕНКА,
фота аўтара.

БАЛЕТ НА КОЛАХ, ЛЕДЗЯНЫЯ СКУЛЬПТУРЫ, АПЕТЫТНЫЯ КАЎБАСКІ...

У Баранавічах з размахам прайшоў фестываль-кірмаш «Берасцейскія сані»

Гэтаму зімоваму фестывалю, здаецца, хапіла ўсяго, за выключэннем самой зімы. Таму «Сані» ў самыя розных сваіх праяўленнях вымушаныя былі рухацца на колах. Але ж навагодні антураж кожнай фестывальнай пляцоўкі захоўваў і падтрымліваў святочны настрой. Было шмат песень і танцаў, самых розных пачастункаў, захапляльных відовішчных мерапрыемстваў. Стары Новы год Баранавічы святкавалі з 13 да 15 студзеня.

Варта аддаць належнае аўтарам навагодняга фэсту. Ён зарадзіўся летась у Брэсце як гарадское мерапрыемства і сабраў столькі водгукаў, адабрэння ды прызнання, што хутка стаў абласным набыткам і атрымаў яшчэ большы размах. Фестываль не застаўся незаўважаным нават на рэспубліканскім узроўні. Прывітальны адрас гасцям і ўдзельнікам свята накіравала **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА.** У прывітанні адзначаецца, што праект набывае асаблівую значнасць у новым 2023 годзе, аб'яўленым Годам міру і стварэння: «Гэта цудоўная ініцыятыва, якая абуджае інтарэс да самабытнай творчасці і ўкладу жыцця берасцейцаў. Фестываль дае магчымасць прадэманстраваць тысячам беларусаў і гасцям нашай краіны багацце духоўнай і культурнай спадчыны, дасягненні ў прамысловай сферы, аграмадны інтэлектуальны і крэатыўны патэнцыял жыхароў, умацоўваючы дух адзінства на аснове любові да роднай зямлі, павагі да яе гісторыі, гонару за сучасныя поспехі».

Адрас зачытаў **старшыня аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА,** адкрываючы фестываль. Таксама ён уручыў **старшыні Баранавіцкага гарвыканкама Міхаілу БАЦЭНКУ** сертыфікат на 5 тысяч рублёў за перамогу ў абласным конкурсе навагодніх ёлак. Па выніках інтэрнэт-галасавання, баранавіцкая ёлка, устаноўленая на галоўнай плошчы, набрала найбольш прыхільнікаў. Мэр адразу ж паведаміў, што грошы будуць перададзены дзецям, якія маюць патрэбу ў дапамозе.

Самай захапляльнай часткай фестывалю стаў маляўнічы парад-карнавал. На разнастойных грузавіках праехалі цэлыя інсталяцыі, дзе разгортваліся самыя неверагодныя сюжэты. Не дзіва, што параднае шэсце пачаў цягнік. Баранавічы — горад чыгуначнікаў — паявіўся на карце нашай краіны менавіта як чыгуначны вузел. Трактар цягнуў заапарк мясцовага прадпрыемства «Дыпрыз» з ламамі, янотамі, зайцамі ды іншымі насельнікамі «Парку жывёл», які размешчаны ў прыгарадзе. А на адной з матарызаваных платформаў адбывалася дзея сусветна вядомага балета «Шчаўкунок», прычым не самадзейная пастаноўка, а ў выкананні артыстаў Вялікага тэатра Беларусі. Балет падарыў удзельнікам свята «Савушкін прадукт». Брэсцкі мясакамбінат здзівіў гасцей казачным кутком Лапландыі — радзімы Дзеда Мароза. Не засталіся незаўважанымі платформы Брэсцкага лікёра-гарэлачнага завода, птушкафабрыкі «Дружба», кампаніі «Атлант», прадпрыемства «Баранавічхлебапрадукт», Баранавіцкага баваўнянага аб'яднання ды іншых вытворцаў вобласці. Усе зрабілі свае рухомыя экспазіцыі прывабнымі.

Цікавай атрымалася і нерухомая выстава прамысловых прадпрыемстваў рэгіёна, якая была разгорнута па вуліцы Камсамольскай. Прадпрыемствы, банкаўскія і навучальныя ўстановы аздобілі свае павільёны рознымі забавамі — фотазонамі, бяспройгрышнымі латарэямі, гульнямі. Тут можна было выйграць пару абутку і ўпакоўку пральнага парашку, набыць мэблю, іншыя тавары. Побач дэманстравалі навінкі вытворчасці і частавалі апетытнымі каўбаскамі з грыля. А на эксазіцыі вузла паштовай сувязі прапаноўвалі адправіць паштоўку з эмблемай фестывалю сваім адрасатам.

Свята тым часам набірала абароты на розных пляцоўках горада. Людзі частаваліся каля імправізаваных гандлёвых павільёнаў. На бульвары Штокерау разгарнуўся гандаль таварамі рамеснікаў. Можна было набыць самыя розныя сувеніры і патрэбныя ў гаспадарцы рэчы.

— Такога яшчэ ў горадзе дакладна не было, — падзялілася ўражаннямі баранавічанка Людміла Васільева. — Каб столькі людзей адразу — столькі артыстаў, удзельнікаў, гандляроў! Купіла некалькі мілых сувеніраў.

Людзі гулялі цэлымі сем'ямі, фатаграфаваліся каля розных адметнасцяў. Асабліва шматлюдна было каля ледзянога гарадка. Гэта вам не жартачкі: фактычна вясновым надвор'ем пабудаваць замкі і скульптуры з лёду! Казалі, што на гэту прыгажосць пайшло дзве фуры замарожанай вады, а спецыялісты працавалі каля двух месяцаў. Лядовае царства падарыў фестывалю Брэсцкі мясакамбінат.

Вечарам адбылося лазернае шоу, якое спраектавалі на дзевяціпавярховы будынак гасцініцы «Гарызонт». Такое было ўпершыню ў горадзе, відовішча выклікала буру эмоцый. Завяршыўся другі фестывальны дзень маляўнічым феерверкам і вясёлай дыскатэкай.

Нядзеля, трэці дзень фестывалю, адзначылася лёгкаатлетычным кросам «Вадохрышчанскія забегі», які сабраў некалькі соцень аматараў бегу, удзельнічалі госці і з іншых гарадоў. Спаборніцтва арганізавалі дэмакратычна: для пачаткоўцаў прапаноўвалі тры кіламетры, іншыя маглі выбраць дыстанцыю ў 9 і 15. Былі вызначаны лідары кожнай дыстанцыі. Аднак галоўны вынік усё ж — усеагульны зарад бадзёрасці.

У размове з журналістамі губернатар Брэстчыны Юрый Шулейка заўважыў, што такія масавыя гулянні патрэбныя людзям як узор культурнага адпачынку, практыка наладжвання свят будзе прадоўжана ў розных гарадах:

— Налета «Берасцейскія сані» паедуць у Пінск, каб ужо па новым сцэнарыі душэўна ўвасобіць мару кожнага чалавека пра Новы год.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
фота БелТА.

Узнёслы матыў Калядак

У Гродне 20-ы раз распачаўся «Каложскі дабравест»

Свята праваслаўных песнапенняў з'яўляецца значнай падзеяй у культурным жыцці Гродзеншчыны. Упершыню фестываль адбыўся ў 2002-м у гонар 10-годдзя адраджэння Гродзенскай епархіі. Паступова ён набыў статус міжнароднага. Сёлета фестываль адноўлены пасля некалькіх гадоў перапынку.

Галоўная прыкмета традыцыйнага фестывалю — яго калядны настрой. Ён ладзіцца менавіта падчас Каляднага перыяду. На гэта скіравана і тэматыка рэпертуару яго ўдзельнікаў. Калядными песнапеннямі адкрыў фестывальную праграму архіерэйскі хор гродзенскага Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора ў нядзелю, 15 студзеня.

Тут, у саборы, прайшоў першы канцэрт лепшых прыходскіх хароў горада Гродна. Таксама выступілі дзіцячыя хары нядзельных школ і хор святароў епархіі. Аб тым, што гэты фестываль папулярны ў горадзе, сведчыць вялікая колькасць аматараў духоўнай музыкі, якія прыйшлі на канцэрт. Сабор на некалькі гадзін стаў глядзельнай залай, якая была запоўнена. Многія гараджане наведваюць фестываль на працягу многіх гадоў. У іх ліку гродзенка Марына, якая прысутнічае на яго канцэртах з 2002 года. Кажа, што яна не можа прапусціць такую падзею.

— Гэта сапраўды чароўная з'ява, калі музыка і малітва аб'ядноўваюцца і ўзносяцца ў вышыню. Добра, што ёсць магчымасць слухаць гэта простым людзям, а выканаўцам даносіць радасць. Вельмі высокая музычная культура, ёсць магчымасць даведацца аб багатым пласце духоўнай музыкі, — дзеліцца ўражаннямі Марына.

Яна, як і многія іншыя наведвальнікі, не хавае эмоцый. Фестываль чакалі, з-за эпідэміялагічнай абстаноўкі яго некалькі гадоў не праводзілі. Па бласлаўленні **архіепіскапа Гродзенскага і Ваўкавыскага АНТОНІЯ** вырашана «Каложскі дабравест» аднавіць. Сёлета фестываль стаў юбілейным, ён праходзіць 20-ы раз.

— На працягу сваёй гісторыі ён прыцягваў вялікую ўвагу харавых калектываў праваслаўных цэркваў розных краін свету. Удзел у гэтым фестывалі лічыцца прэстыжным. Сёлета мы вырашылі вярнуць яго, пакуль у маштабе нашай Гродзенскай епархіі. Царкоўныя песнапенні прагучаць на царкоўнаславянскай, беларускай, рускай, украінскай, польскай мовах, бо Нараджэнне Хрыстова сустракае ўвесь свет, — зазначыў уладыка Антоній.

Па яго словах, юбілейны фестываль стане ўнікальнай магчымасцю пачуць спевы розных хароў, якія гучаць у храмах вобласці. Некаторыя маюць свае адметныя матывы, што выконваліся да XX стагоддзя.

Тое, што «Каложскі дабравест» праводзіцца падчас Каляднага перыяду, сімвалічна, і мае свой глыбокі сэнс.

— Выкананне песень падчас каляднага перыяду невыпадкова ўвайшло ў нашу традыцыю. Анёлы праслаўляюць Бога за нараджэнне Ісуса спевамі. У памяць аб тым людзі таксама спрабуюць гэта пераняць і сустракаюць Збавіцеля Хрыста песнапеннем, — растлумачыў архіепіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Антоній.

Сёлета на фестывалі выступяць больш за 90 прыходскіх калектываў. Як расказала **дырэктар і мастацкі кіраўнік Міжнароднага фестывалю праваслаўных песнапенняў Наталля ГАПЛІНЧЫК,** канцэрты, якія распачаліся ў Гродне 15 студзеня, будуць праходзіць у храмах і цэнтрах культуры вобласці да 12 лютага.

— Унікальнасць фармату ў тым, што падчас канцэртных выступленняў можна будзе пазнаёміцца з творчасцю многіх царкоўных калектываў епархіі — ад вялікіх хароў гарадскіх храмаў да маленькіх ансамбляў цудоўных вясковых цэркваў. Упэўнена, што ўсюды канцэрты будуць праходзіць з такім жа вялікім наплывам слухачоў, як гэта адбылося падчас адкрыцця. Людзі сапраўды чакалі гэтыя канцэрты духоўнай музыкі, як, дарэчы, і самі выканаўцы, бо кожнаму хору важна адчуць вынік сваёй работы, — зазначыла дырэктар фестывалю.

35	Нивелир (н/раб.), инв. 60048-а	83,16	8,32	4,16
36	Ноутбук 15,6 «Самсунг» 305E5Z РФ, инв. 761	168,00	16,80	8,40
37	Ноутбук 15,6 «Самсунг» 305E5Z серебр. РФ, инв. 746	168,00	16,80	8,40
38	Опалубка монолитных стен Конте РФ, инв. 782: 1. щит 3000*1200 мм (49 шт.); 2. щит 3000*1100 мм (1 шт.); 3. щит 3000*1000 мм (3 шт.); 4. щит 3000*900 мм (1 шт.); 5. щит 3000*800 мм (2 шт.); 6. щит угловой (4 шт.); 7. анкер торцевой (4 шт.); 8. болт стяжной SAS15FC (96 шт.); 9. гайка стяжная оц 90 мм (190 шт.); 10 замок клиновый (75 шт.); 11. замок универс оц (55 шт.); 12. захват крановый «Гамма» (2 шт.); 13. кронштейн подмостей (25 шт.)	5870,34	587,03	293,52
39	Отбойный молоток SDS-max «Макита», Литва (н/раб.), инв. 706	226,80	22,68	11,34
40	Отбойный молоток вневмо. МО-2Б (РФ), инв. 737	109,20	10,92	5,46
41	Отбойный молоток пневмо. МО-4Б (РФ) (н/раб), инв. 721	92,40	9,24	4,62
42	Перфоратор GBH 2-26 DFR с патроном с-м (Германия), инв. 765	92,40	9,24	4,62
43	Перфоратор GBH 4-32 DFR Герм (н/раб.), инв. 777	310,80	31,08	15,54
44	Перфоратор SDS plus GBH 4-32 Герм (н/раб.), инв. 728	201,60	20,16	10,08
45	Перфоратор SDS plus Bosch GBH 2-28 DFV Германия (н/раб.), инв. 753	84,00	8,40	4,20
46	Перфоратор SDS plus Bosch GBH 4-32 DFR Германия, инв. 719	310,80	31,08	15,54
47	Перфоратор «Макита» HP2450 SDS plus (н/раб.), инв. 656	82,32	8,23	4,12
48	Перфоратор TE 30-C-AVR Австрия (н/раб.), инв. 779	100,80	10,08	5,04
49	Пила цепная эл. «Макита» UC4020F 1800Вт попереч. двиг. н (н/раб.), инв. 647	42,84	4,28	2,14
50	Подъемник к-1, инв. 140	462,00	46,20	23,10
51	Подъемник к-1, инв. 302	462,00	46,20	23,10
52	Полуавтомат МИДИ Макстер 1800, инв. 501	420,00	42,00	21,00
53	Пуско-зарядное устройство 24-12 Вт, инв. 638	168,00	16,80	8,40
54	ПЭВМ «Сильверадо» (мышь, монит. 19, клав.) без сист. комплект, инв. 500	32,76	3,28	1,64
55	Сварочный агрегат (н/раб.), инв. 530	176,40	17,64	8,82
56	Смеситель ЕМ1-950К (н/раб.), инв. 629	92,40	9,24	4,62
57	Телефакс, инв. 98	10,08	1,01	0,50
58	Теодолит ЗТ5КП (н/раб.), инв. 794	428,40	42,84	21,42
59	Углошлифмашинка «Макита» GA50301 (н/раб.), инв. 657	48,72	4,87	2,44
60	Теплогенератор, инв. 433	226,80	22,68	11,34
61	Транспортер, инв. 407	638,40	63,84	31,92
62	Устройство пускозарядное ПЗУ-250, инв. 640	57,96	5,80	2,90
63	УШМ двуручная GWS 22-230 H Bosch (н/раб.), инв. 653	43,68	4,37	2,18
64	Шлагбаум ASB600 Китай, инв. 760	352,80	35,28	17,64
65	Шлифмашинка угловая Bosch GWS 9-125 Германия, инв. 793	47,04	4,70	2,35
66	Котел отопительно-водогрейный, инв. 65	714,00	71,40	35,70

В отношении лота 1 проводятся первые торги. В отношении лота 2 проводятся шестые повторные торги.
Стоимость имущества снижена на 80 %. В отношении лота 3 проводятся шестые повторные торги.
Стоимость имущества снижена на 85 %. В отношении лота 4 проводятся шестые повторные торги.
Стоимость имущества снижена на 90 %. В отношении лотов 5–66 проводятся вторые повторные торги.
Стоимость имущества снижена на 30 %. Публикация об аукционе по всем указанным лотам ранее размещалась в газете «Звязда» № 231 (29853) от 24.11.2022, стр. 14

Дата и время проведения открытого аукциона	**17 февраля 2023 года в 14.30 (по лоту 1), регистрация с 14.00 до 14.25** **30 января 2023 года в 14.30 (по лотам 2–66), регистрация с 14.00 до 14.25** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и оплаты задатка	**с 10.00 17.01.2023 до 16.00 15.02.2023 (по лоту 1)** **с 10.00 17.01.2023 до 16.00 26.01.2023 (по лотам 2–66)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Местонахождение имущества	Лот № 1: г. Гродно, ул. Дубко, д. 11В. Лот № 2: г. Витебск, ул. Полярная, д. 2Д. Лоты № № 3–66: г. Гродно, ул. Дубко, д. 11

Земельный участок по Лоту № 1: зем. участок с кадастровым № 440100000002011324, пл. – 0,0046 га, целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания трансформаторной подстанции, расположение – Гродненская обл., г. Гродно, ул. Дубко, 11, право постоянного пользования.
По Лоту № 2: зем. участок с кадастровым № 240100000001009096, пл. – 0,7139 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания производственно-административных зданий и сооружений, расположение – Витебская обл., г. Витебск, ул. Полярная, 2, 27/100 доли в праве аренды (договор аренды).
Ограничения: земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, код – 7, пл. 0,0784 га; земли, находящиеся в санитарно-защитных полосах водоводов, код 4, пл. – 0,0037 га

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа – **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Трест Белстромремонт», проводимых ___.___.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.
Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по тел.: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
Вознаграждение аукциониста по Лотам №№ 3–66 – 7 % (семь процентов), по Лотам №№ 1, 2 – 5 % (пять процентов) от конечной цены предмета торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней (по лотам №№ 3–66) и в течение 14 (четырнадцати) рабочих дней (по лотам №№ 1, 2) с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней (по лотам №№ 3–66) и не позднее 30 (тридцати) рабочих дней (по лотам №№ 1, 2) со дня подписания договора.
Государственная регистрация договора купли-продажи по лотам №№ 1, 2 и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов.
По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону: +375295894134, Ольга Михайловна.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, демонтажом и вывозом (в том числе при наличии технических препятствий) осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет.

Продавец	**Открытое акционерное общество «Трест Белстромремонт» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», +375 29 304 59 90, 8017 255 29 28)**
Организатор торгов	**ООО «Фрондера»:** **☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by** **220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127**

Информация об объявленных повторных электронных торгах и предмете повторных электронных торгов

Организатор электронных торгов – комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета (УНП 100048181)
Продавец – республиканское объединение «БЕЛАГРОСЕРВИС».
Оператор электронной торговой площадки – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
Электронный адрес электронной торговой площадки – https://et.butb.by

Дата электронных торгов	Сведения о предмете электронных торгов	Местонахождение имущества	Начальная цена, руб.	Информация о публикации извещения
01.02.2023	Производственная база (10 капитальных строений, многолетние насаждения, движимое имущество), часть площадей сдается в аренду. Право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,8378 га, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах электронных торгов либо признании электронных торгов несостоявшимися	г. Минск, ул. Брестская, 42, 42/1, 42/2, 42/3	883 630,88	Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на **https://au.nca.by/item/2552599** и **https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/prodazha_arenda/**

УНП 100048181

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Смолевичский райагросервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МОЛОЧНОГО ЦЕХА

(составные части и принадлежности: пристройка) **общей площадью 188,6 кв. м с инв. № 614/С-40475, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624800000001000855** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,2773 га по адресу: Минская область, Смолевичский район, Усяжский с/с, в районе д. Тадулино.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0065 га.

Начальная цена с НДС – **47 260,16** бел. руб. *Начальная цена снижена на 5 %.*

Задаток 10 % от начальной цены – **4 726,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 30.07.2022, 18.10.2022.

Аукцион состоится **02.02.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.02.2023** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра (8029) 145-17-40.

УНН 600048461

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Алена Руцкая мае за плячыма дзесяцігоддзі працы ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы ў якасці дацэнта кафедры беларускай літаратуры (цяпер — кафедра беларускай філалогіі). Вядомая даследчыца, аўтарытэтны вучоны, заслужаны настаўнік Беларусі, аўтар навукова-метадычных прац, нарысаў, артыкулаў, Алена Руцкая вядомая і як пісьменніца. Нядаўна пабачыла свет яе новая кніга — зборнік нарысаў-эсэ «Памятныя сустрэчы», героі якой — славутыя дзеячы літаратуры, культуры і навукі Прынёманскага краю.

Чытачам «Звязды» прапануецца апавяданне, якое сведчыць пра багаты жыццёвы вопыт пісьменніцы, назіральнасць, пачуццё гумару і валоданне трапным мастацкім словам.

Алена БРАВА

Алена РУЦКАЯ

ЛЁС У НАГРУЗКУ

Дзядок урэшце выбраў часопіс і пачаў адлічваць грошы. Увішная кіяскёрша адсачыла сферу цікавасці пакупніка, хуценька выграбла са стосіка неякі штотыднёвік і клапатліва прапанавала набыць, даверліва паведаміўшы, што і сабе купіла, і суседцы па лецішчы. Дзядок іранічна хмыкнуў: «Гэта што? У нагрузку?» Дзяўчына сумелася — не зразумела. Да яе веку «нагрузкі» не датрымаліся.

Пагурская, што стаяла следам, коратка «прасвятліла» прадаўшчыцу, а ўжо адышоўшы ад кіёска, убачыла дзядка — падобна, чакаў яе. Калі параўнялася, ён сказаў:

— Моладзь ужо і не разумее, што за нагрузкі. Сучасныя рэкламкі і тавар прапаноўваюць, і падаруначкі да яго абяцаюць.

— Хіба кепска? — чамусьці злаславіла адгукнулася Пагурская.

— Не, канешне, — згодліва прамовіў няпрошаны спадарожнік і, як бы баючыся перарваць кволую нітачку размовы, хутка загаварыў аб тым, чаго толькі не прыходзілася купляць у нагрузку, каб набыць нешта вартае, жаданае.

Пагурская ўжо крыху разгледзела мужчыну. Ён быў недзе яе веку — каля сямідзесяці, з адмыслова пастрыжанай бародкай, у меру даўгаватымі сівымі валасамі, такімі, якія амаль ніколі не саступаюць месца лысіне. «Або балбатун, або жыве адзін і хоча хоць з кім пагаварыць», — адзначыла сабе. Спадарожнік тым часам зрабіў кароценькую паўзу і, убачыўшы, што жанчына не намерваецца нічога сказаць, прадоўжыў:

— А ведаеце, у гарадку, дзе я вырас, быў цікавы выпадак — якраз з гэтымі самымі нагрузкамі. Вярнуўся з Амерыкі мужчына. Ён да вайны, яшчэ хлопцам, паехаў туды на заробкі. Дык вось, прыехаў, купіў дом. А стрыечны яго брат быў выдатным зубным пратэзістам, уплывовы, вось і ўладкаваў родзіча на працу ў саюздрукаўскі кіёск. Там, вы, пэўна, памятаеце, як і ўсюды, быў план. На яго выкананне давалі крыху дэфіцытаў, а да іх у нагрузку трэба было збываць нехадавое. «Амерыканец» — такую прыляпілі яму мянушку — ніяк не мог зразумець такую схему, тым больш што і некаторыя пакупнікі не хацелі браць непатрэбнае, усчынялі сваркі. Вось і павёў ён гандаль па-свойму. На хадавы тавар цэны падняў, а на «нагрузачны» на такія ж сумы панізіў. Народ на жаданае грошай не шкадаваў, а за капеечнае сварыцца перастаў. Некаторыя разлічваліся і нагрузку не бралі ці тут жа кідалі ў сметніцу. «Амерыканец» складваў выкінутае ў асобны стосік і рэалізоўваў у межах ад адной да пяці капеек. Бабулі сталі купляць танную макулатуру на распальванне печы, на кулькі, у якіх прадавалі семкі і насенне, і ўвогуле хто на што. План забяспечваўся, і сабе прыварак у некалькі рублёў у месяц набягаў. Але, як кажуць, да пары збан ваду носіць. Патрапіў да гэтага кіёска чалавек, які ў гэты ж дзень у такім жа гандлёвым пункце купіў дэфіцытную кнігу, а ў нагрузку да яе дадалі нейкую брашурку. І вось убачыў той пакупнік, што тут «нагрузка» на дзесяць капеек дзешавейшая. Не змог дараваць такога кашчуннага падману і панёсся па інстанцыях скардзіцца. Так выкрылі капіталістычны падыход у дзяржаўным гандлі.

— І што з ім стала? — неяк міжволі пацікавілася Пагурская.

— Ды зноў брат выручыў. Уладкаваў кінамеханікам, — задаволена, што зацікавіў такі гэту насупленую жанчыну, паведаміў дзядок.

Размова затухла. Колькі крокаў яны прайшлі побач моўчкі. Пагурская прыпынілася, паглядзела на спадарожніка з намерам неяк дзяжурна развітацца, а той нечакана ўсмешліва прапанаваў:

— Мы ж усё роўна ў адзін бок ідзём, то цяпер вы мне што-небудзь раскажыце.

Сапраўды, яны ўжо ішлі ўздоўж агароджы, за якой укладвалі трубы. Крыху раздражнёная тым, што неяк саступае гэтаму чалавеку, Пагурская з прыхаванай здзеклівасцю запытала:

— Пра нагрузкі?

Прамовіла, памаўчала і раптам прыпынілася.

— Нешта забыліся? — заклапочана спытаў спадарожнік.

— Здаецца, наадварот, успомніла, — і, злавіўшы зацікаўлены погляд, пачала расказваць. — На трэцім курсе мне даручылі распаўсюджваць білеты. Найгорш было з «нагрузачнымі». Тым разам мне далі пяць білетаў на фантастычна папулярнага тады балгарскага спевака Бісера Кірава, а да іх у нагрузку — чатыры білеты ў філармонію на выступленне маладых скрыпачоў. З горам папалам збыла два, яшчэ адзін — сабе, а вось чацвёрты — у нагрузку да зоркі эстрады — на здзіўленне, без капрызаў забрала аднагрупніца Ада Шчыгельская. Хлопцы за вочы называлі яе графіняй. Яна была прыгожая, апраналася з густам, цёмна-каштанавыя раскошныя валасы заўсёды былі хораша ўкладзены ў высокую мудрагелістую прычоску, а галоўнае — уражвалі яе паставa і хада. Шклянку паўнюткую вады Ада пранесла б на галаве не скалыхнуўшы.

У прызначаны час я разгублена стаяла каля філармоніі. Ніхто з трох «нагрузачных» не прыйшоў. Ужо кіруючыся да ўвахода, азірнулася: да мяне няспешна крочыла Шчыгельская. На маё «пазней не магла» Ада пакруціла перад маім носам маленькім вясновым букецікам: некалькі фіялачак у атачэнні трох яловых галінак. «Вось, у бабулькі купіла. Падару таму, хто будзе карацей за ўсіх пілікаць», — абвясціла яна. І я перастала шкадаваць, што нашы месцы амаль у самым канцы залы.

Змяняліся музыкі, Ада бавіла сябе прыхаваным разглядваннем публікі. Раптам жанчына перад намі з'едліва і даволі гучна прашаптала на вуха суседцы, што зараз выйдзе бяздарнасць, якую прасоўваюць у фінал, што прыкупілі букетаў, падрыхтавалі ўручальнікаў. Вочы Шчыгельскай нядобра прыжмурыліся. Гэту скрыпачку яна слухала ўважліва, хоць, калі брала білет у нагрузку, прызналася, што ў такой музыцы нічога не разумее. А цяпер, як і я, разлічвала на тое, што павінна ж нешта падказаць абуджанае жаданне справядлівасці. Ці спрацаваў эфект лыжкі дзёгцю (каментарый жанчыны), або выкананне сапраўды было нейкае прэсна бездакорнае, не адухоўленае тым таемным, што кранула б і нашы не паланёныя такой музыкай сэрцы, — выступленне не ўразіла. Затое сапраўды, калі дзяўчына раскланялася, там-сям моцна запляскалі, нібы падначваючы іншых, з двух бакоў на сцэну ўзбегла чалавекі чатыры з букетамі. Да гэтага букет сціпла падалі толькі адной дзяўчынцы. Скрыпачка раскланьвалася, расчулена прыціскаючы букеты да грудзей, а канферансье нават паслужліва падхапіў яе скрыпку. «Трыумф удаўся!» — злосна адзначыла тая ж кабета.

Публіка была ўзрушана, перамаўлялася, і новы выканаўца застаўся амаль без увагі. Некалькі секундаў разгублена пастаяў — у гэтай нерухомасці ён нагадваў вытанчаную парцалянавую статуэтку — і пачаў іграць, як у нейкі выратавальны свет, паглыбляючыся ў гукі скрыпкі. Урэшце зала засяродзілася. Хлопец закончыў выступленне, неяк безнадзейна пакланіўся, узняў галаву і застыў. Застыў і канферансье, што ўжо з'явіўся з-за куліс. Зала насцярожылася. І тут толькі я ўбачыла, што Шчыгельская ўжо ўстала і рушыла да сцэны. Словам «ішла» нельга было і блізка перадаць яе хаду. Стройная, у прыгожай вішнёвай сукенцы, з пацеркамі з чэшскага шкла, што ўспыхвалі зорачкамі пад святлом крыштальных люстраў, яна нібы зачароўвала залу. Каля прыступак затрымалася, і канферансье, падпарадкоўваючыся яе позірку, падбег і правёў на сцэну. Яна наблізілася да скамянелага скрыпача, што трымаў у апушчаных руках скрыпку і смычок, на імгненне прыпынілася, пасля далікатна забрала з яго рукі смычок і ўклала ў вызваленую далонь свой вясновы букецік. Затым прыгожа хітнула галоўкай, павярнулася, усміхнулася публіцы, аддала смычок канферансье. Той ужо ачуняў ад такой неспадзяванкі, галантна дапамог дзяўчыне спусціцца са сцэны і, вярнуўшыся, запляскаў у далоні. Зала дружна падхапіла, паглядаючы то на сцэну, дзе стаяў, заціснуўшы ў руцэ букецік, шчаслівы скрыпач, то на дзяўчыну, што гожа ішла да свайго месца.

Пасля канцэрта мы няспешна рушылі ў гардэроб. Сталі крыху наводдаль. Я першая заўважыла скрыпача, людзі паслужліва скіравалі яго ў наш бок. Ада паставілася да разгубленага хлопца як да даўняга знаёмага, паблажліва пахваліла. Ён пасмялеў, сказаў, што толькі дзякуючы ёй прайшоў у фінал і паедзе ў Ерэван, пасля працягнуў ёй нейкія білеты і праграмку ды запрасіў прыйсці на канцэрт. «Тут два, — прамовіў да мяне. — Прыходзьце разам». Відаць, баючыся пачуць адмову, стаў прасіць прабачэння, што не прадставіўся. Пазнаёміліся. Тым часам гардэроб амаль апусцеў, і мы паспяшаліся апрануцца. Аднекуль прымчаўся канферансье — ім трэба было яшчэ да некага падысці, а таму хутка развіталіся. Ужо ў трамваі Шчыгельская ўкінула мне ў сумачку тыя білеты і заявіла: «Цяпер гэта табе ў нагрузку, а з мяне хопіць. Паслязаўтра ў Палац спорту, будзем слухаць Бісера Кірава». Я прамаўчала — білеты ў нас былі на розны час.

Лёс распарадзіўся па-свойму. У Палацы спорту Ада зноў сустрэла Севу, так звалі таго скрыпача. І на канцэрт, відаць, ён такі ўпрасіў яе схадзіць. Калі я вяртала білеты, Шчыгельская заявіла, што вось у філармонію са мной пайшла, а цяпер мая чарга «адбываць нагрузку».

Каля ўвахода нас сустрэў Сева, а ў фае падышлі яго бацькі. Маці, яшчэ набліжаючыся і разглядваючы здалёк Шчыгельскую, узрадавалася так, нібы атрымала самы жаданы падарунак. Невысокая, паўнавацеькая, яна закружыла вакол злёгку разгубленай Ады, як пчолка каля духмянай кветкі. Урэшце размясціліся мы па яе раскладцы. Шчыгельскую будучая свякроўка ўладкавала там, дзе былі іх чатыры месцы, а на нашы два да мяне пераслалі Севінага сябра. Ім аказаўся той самы канферансье.

Калі б Пагурская, апавядаючы самой сабе тую даўнюю гісторыю, глянула на свайго суразмоўцу, то заўважыла б, як змяніўся выраз яго твару. Да таго ж ён задумліва вымавіў:

— Фаіна Маркаўна была празорлівіца. Адразу вылічыла, што толькі такая, як Адачка, зараўняе ўсе гарбылі і яміны на жыццёвай сцяжыне яе сыночка.

Пагурская аўтаматычна адгукнулася:

— Ада была шчаслівая ў гэтай сям'і. Падобна, аб такой яна і марыла. Гэта і прымірыла яе з сімфанічнай музыкай.

— Толькі прымірыла,— пагадзіўся мужчына.

Пагурская спынілася, нібы наткнулася на нябачную перашкоду. Усвядоміла, што яны гавораць пра адных і тых жа людзей, і здзіўлена ўтаропілася ў спадарожніка.

Той лагодна ўсмінуўся:

— А я той канферансье. Праўда, даўно сышоў са сцэны — стаў інжынерам. Дарэчы, вы даўно з Адай бачыліся?

Жанчына справілася з разгубленасцю, ціха прамовіла:

— Як яна засталася адна і з'ехала ў свой Нясвіж, так сувязь і страцілася.

— А мы вось тыдзень таму выпадкова сустрэліся, запрасіла на дзень нараджэння, якраз у гэту суботу... А паехалі разам. Я на сваёй машыне. Сапраўды... паехалі.

— Сустрэцца хацелася б, але неяк нябёмка.

— Што няёмка? Яна цябе ўспамінала. Вось сюрпрыз будзе! — ён па-змоўніцку ўсміхнуўся, выцягнуў мабільнік, набраў штосьці і падаў ёй.

«Сустракай. Абавязкова прыеду. З нагрузкай», — апавяшчаў тэкст.

Знаёмімся з лаўрэатамі

КУДЫ «ХАНДЖЭВАЛІ» ШАПАВАЛЫ?

Чым уражвае Дрыбіншчына

Нядаўна кіраўнік дзяржавы ўручыў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва. Сярод калектываў, заўважаных на самым высокім узроўні, — супрацоўнікі Дрыбінскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея, які захоўвае матэрыялы пра традыцыйныя рамёствы і садзейнічае адраджэнню шапавальства.

Схроны

Гісторыя музея вядзецца з 1995 года: з гэтага часу яго супрацоўнікі збіралі экспанаты, думалі пра будучую экспазіцыю. У яе, дарэчы, увайшлі не толькі рэчы, знойдзеныя ў час археалагічных даследаванняў, але і знаходкі, якія мясцовыя жыхары адкопвалі на сваіх агародах. Таксама музей мае добрую калекцыю абразоў пераважна XIX—XX стагоддзяў, перададзеную Мытным камітэтам.

З 2004 года ўстанова пачала прымаць наведвальнікаў. І набыла неафіцыйную назву «Музей шапавальства». Менавіта дзякуючы працы дрыбінскіх музейшчыкаў і майстроў унікальны промысел, які, здавалася, ужо быў незапатрабаваны, стаў вядомы жыхарам усёй Беларусі і за яе межамі, а выраб валёнкаў і ўпрыгажэнняў лічыцца модным заняткам. Пры музеі дзейнічае народнае аматарскае аб'яднанне «Шапавал» і ўзорнае дзіцячае аматарскае аб'яднанне «Катрушнік».

Ёсць розныя версіі, як на Дрыбіншчыне з'явіліся шапавалы. Паводле адной з іх, некалі гэтыя мясціны былі малазаселенымі, і тутэйшы пан, каб прывабіць сюды людзей, рассылаў запрашэнні і абяцаў выгадныя ўмовы. Яго пачулі. На тыя землі сталі прыбываць людзі з рознымі ўменнямі, у тым ліку і шапавалы. Назвалі гэтых валюшнікаў воўны так за тое, што яны рабілі не толькі валёнкі, але і шапкі. Дарэчы, у такой шапцы можна было хадзіць і летам, яна выдатна засцерагала ад сонца. Таксама заказы ў шапавалаў рабілі паляўнічыя і фурманыя — ім патрэбныя былі цёплыя рукавіцы.

Паводле іншай версіі, уладальнік маёнтка Цеханавецкі спецыяльна накіраваў сваіх маладых сялян навучацца валюшнаму рамяству ў Ніжагародскую губерню. Па вяртанні новымі навыкамі тыя дзяліліся ўжо са сваімі дзецьмі, а пасля і ўнукамі.

Сярод шапавалаў былі саматужнікі, якія працавалі ў сваіх вёсках. Як правіла, гэта былі людзі старэйшага ўзросту. Маладзейшым заставаўся адходны промысел. Каб зарабіць грошай, мужчыны бралі няхітры пажытак, прыстасаванні і выпраўляліся ў далёкі шлях, пераважна ў бок Расіі, але часам даходзілі і да Аўстра-Венгрыі. Ёсць адзін задакументаваны выпадак, што майстар Шарлоўскі дабраўся нават да Амерыкі, адкуль сваім родным слаў немалыя сумы. Шапавалы не падарожнічалі па адным, гэта было небяспечна. Усё ж у далёкіх землях, дзе не было такіх майстроў, на валенні шапак і абутку можна было добра зарабіць. А каб канкурэнты не разведалі сакрэты іх рамяства, дрыбінскія шапавалы прыдумалі сваю мову — катрушніцкі лемезень, у якой было каля тысячы слоў. Пра значэнне некаторых з іх яшчэ можна здагадацца. Напрыклад, гэта словы, у якіх перастаўлены склады ці дададзены новыя. Няцяжка здагадацца, што азначаюць словы «кувечар», «кутуча», «кудуб» ці што ў «ласому» ператварылася «салома», у «катосы» — слова «каторы». А вось паспрабуйце на шапавальскай мове палічыць «Свя, бакрых, страмах, бутара». Ці разабрацца, што майстры просяць адзін у аднаго словамі «часмоніць», «максаць», «сепаць». Часам такія шыфроўкі былі патрэбныя, каб надурыць гаспадара. Але яны маглі і ратаваць жыццё. Супрацоўнікі Дрыбінскага музея паспелі запісаць гісторыю ад шапавала, які распавёў, як ім сапраўды дапамог катрушніцкі лемезень. Мужыкі ўжо выканалі багата заказаў, зарабілі вялікую суму і меліся ісці далей. Выпадкова адзін з майстроў на вуліцы падслухаў, як гаспадыня, у якой яны спыніліся, падгаворвае нейкіх мужыкоў абкрасці шапавалаў і забіць іх. Майстар паспеў на сакрэтнай мове папярэдзіць свайго калегу. Кінулі яны тады ўсе свае рэчы і ўцяклі праз акно.

У гісторыка-этнаграфічным музеі Дрыбіна можна ўбачыць і выстаўкі сучасных юных аматараў валення, і майстар-класы вопытных майстроў. Напрыклад, Уладзімір Асіпоўскі шапавальствам займаецца ўжо больш за тры дзясяткі гадоў. Ён раскрывае некаторыя сакрэты. Напрыклад, што воўну нельга мыць, і таму вельмі важна яе якасна перабараць уручную, пазбавіць ад каўтуноў і смецця. Ад таго, як будзе падрыхтавана сыравіна, залежыць якасць будучага вырабу. На мужчынскія валёнкі можа ісці каля двух кілаграмаў воўны, жаночыя — каля кілаграма. Пры валенні воўны трэба выкарыстоўваць максімальна гарачую ваду, наколькі рукі змогуць трываць. А ўжо гатовыя валёнкі высушваюцца ў негарачай печы. Не бывае левых ці правых валёнкаў. Новы абутак раяць спачатку панасіць, пасля памяняць на нагах месцамі. Паступова валёнкі «прыстасуюцца» пад нагу гаспадара...

Натуральна, шапавальства — галоўная «разыначка» Дрыбінскага музея, хоць тут можна даведацца і пра іншыя рамёствы, якімі займаліся мясцовыя жыхары.

Дрыбін ці Дробін?

Яшчэ ў 90-я гады XX стагоддзя ў раёне было багата бондараў, а найбольш у вёсцы Кіншчыцы. Яны выраблялі кадкі, дзежкі, цэбры ды іншы посуд. Добры майстар пры нарыхтоўцы драўніны для вырабу будучага посуду ўлічваў яе якасць, вільготнасць, пароду дрэў. На Дрыбіншчыне майстры выкарыстоўвалі сасну і елку, з якімі прасцей працаваць, чым з дубам. У пашане была і асіна. Музейшчыкі падчас экспедыцый чулі ад старых людзей, што менавіта ў асінавай бочцы салёныя грыбы атрымліваліся асабліва смачнымі. Займаліся бондарствам звычайныя сяляне. Калі заканчваліся работы ў полі, у асенне-зімовыя вечары проста ў сваёй хаце ці ў сянях яны браліся за «драўляныя» справы.

Былі на Дрыбіншчыне і сталяры. Без куфраў не абыходзілася ні адна гаспадыня. Па такіх скрынях нават меркавалі аб дабрабыце ў сям'і. Лічылася, чым іх больш, тым заможнейшыя гаспадары. Куфры выкарыстоўвалі не толькі як шафы — на іх можна было сядзець, спаць, карыстацца як сталом. Куфры людзі стараліся ўпрыгожыць і знутры, і звонку. Унутры куфры маглі абіваць тканінай. Рабіліся аддзелы для драбязы. На вечках куфраў іх уладальнікі змяшчалі паштоўкі і фатаграфіі.

Як і па ўсёй Беларусі, дрыбінскія гаспадыні зімовымі вечарамі займаліся ткацтвам. Сыравіну выкарыстоўвалі сваю, вырошчвалі лён. Рэгіянальныя ручнікі выбельваліся, упрыгожваліся вышыўкай. Адны з іх — уціральнікі — выкарыстоўваліся ў быце, іншыя, багата ўпрыгожаныя, вешалі на абразы па святах. А яшчэ былі ручнікі, якія выкарыстоўвалі ў абрадах: радзільна-хрысцільных, памінальных, вясельных. У раёне ёсць нават выраз «стаць на ручнік», які азначае «выйсці замуж, ажаніцца». Менавіта на ручніку маладыя на вянчанні стаялі ў царкве.

Цікавінкі для гасцей

Нядзіва, што Дрыбін стаў запатрабаваным сярод купцоў, праз гэтыя землі праходзілі гандлёвыя шляхі. Ёсць нават версія, што ранейшая назва была «Дробін». Драбінамі тут звалі запрэжаны коньмі воз. На мясцовым кірмашы гандаль мог ісці менавіта з вазоў. Дарэчы, у наш час кожнае лета любы ахвотны можа трапіць на «Дрыбінскія таржкі» — так сёння называецца рэгіянальны фестываль народнай творчасці, промыслаў і рамёстваў.

Дрыбіншчына ведае, чым уражваць гасцей раёна. Сустрэча з шапаваламі становіцца адной з запатрабаваных «фішак» для турыстаў, але тут ёсць багата іншых мясцін, вартых увагі. Турыстычны патэнцыял раёна быў прадэманстраваны летась падчас семінара Нацыянальнага агенцтва па турызме. Гасцям раяць заехаць у аграгарадкі Трылесіна (тут можна паглядзець помнікі прыроды — велічэзныя дрэвы, якім пад дзве сотні гадоў) і Расна (некалі гэтая мясціна была горадам, праз які праязджалі знакамітыя асобы). Касцёл Святога Казіміра ў Расне сёння мае патрэбу ў тэрміновай рэканструкцыі. Вельмі важна захаваць гэты помнік архітэктуры, тым больш што да аграгарадка ўсё часцей едуць турысты, у тым ліку тыя, якіх цікавіць ваенная гісторыя. У 1942 годзе тут былі расстраляны мясцовыя яўрэі. Каб ушанаваць іх памяць, людзі ідуць да абеліска, узведзенага на месцы трагедыі.

У Расне ёсць і невялікая зала этнаграфіі з фітапакоем, дзе можна даведацца пра мясцовыя зёлкавыя сакрэты і выпіць духмянай гарбаты. А можа, гасцям захочацца пакаштаваць вады з Грымучай крыніцы, якая, калі верыць тутэйшым жыхарам, гаючая.

Часам у Дрыбінскім раёне жартуюць, што тут закрыты ўсе сезонныя запыты па абутку. Акрамя шапавалаў, у раёне жывуць майстры, што робяць традыцыйныя лапці з ліпавага лыка, асаблівага, прамога пляцення. Дарэчы, тэхналогія іх вырабу, гэтак жа, як і шапавальства, унесена ў Нацыянальны спіс па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. Даведацца больш пра «лыкавае» рамяство можна ў Доме рамёстваў аграгарадка Кароўчына. Рамяство мясцовыя майстрыхі перанялі ў носьбітаў падчас экспедыцый. Старыя людзі расказвалі, што напляталі лапці мяхамі і неслі ў горад мяняць на муку, прадаваць. Ды і самім вяскоўцам лапцей патрабавалася не адна пара. Бабулі згадвалі, як дабіраліся да клуба басанож — там ужо абувалі лапці. Калі гулянка задавалася, танцавалі так, што лапці пасля маглі і разляцецца. Тых старых ужо няма на гэтым свеце, а дрыбінскія лапці сёння спрабуюць плесці нават малыя. Пры Доме рамёстваў створаны ўзорны гурток «Лапаточак». Сёння такі абутак замаўляюць кінастудыі, аграсядзібы ды нават маладыя людзі, якія ў інтэрнэце вычыталі, як карысна яго насіць.

Саміх жа супрацоўнікаў Дома рамёстваў чакаюць хлопчыкі і дзяўчынкі ў школах. Прычым на любыя святы: Каляды, Саракі, Масленіцу. З лапцямі, аказалася, можна ладзіць цэлую гульнявую праграму. Напрыклад, дзяўчаты любяць паваражыць — раскруціць над галавой і запусціць: у які бок паляцяць — туды і замуж ісці. Некаторыя гульні з лапцямі пазычаны ў мясцовых жыхароў, а нешта супрацоўнікі Дома рамёстваў прыдумалі самі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

«А СТАРАСЦІ НЯМА! ТЫ ЁЙ НЕ ВЕР...»

Юбілейныя таямніцы Канстанцыі Буйло

Канстанцыя Буйло. Настаўніца. 1915 г.

Колькі цікавага і загадкавага ў біяграфіі гэтай паэткі!
Хаця пазнаецца яна найперш па адным вершы, напісаным у родным Вішневе на Валожыншчыне, пры сузіранні квітнеючых садоў: «Люблю наш край, старонку гэту...»

Канстанцыя Буйло і Уладзіслава Луцэвіч. 1945 г.

Пра сваё паходжанне Канстанцыя Буйло пісала так:

«Бацька быў
аб'ездчыкам у графа,
Ля стала ў яго стаяла
шафа,
У ёй два кляймы,
нейкіх тры пячаці,
Пухлы і тоўсты
скорасшывацель,
Шмат квітанцый,
шмат канторскіх кніжак,
Паміж шафай
і сцяною — лыжы».

У сям'і шмат чыталі, быў нават свой сямейны музычны ансамбль... А вучыла Канстанцыю французскай мове суседка-француженка Эмілія Станкевіч, з чыёй дачкой, Уладзіславай, звязала моцнае сяброўства — да канца дзён. Разам набывалі настаўніцкую адукацыю, разам працавалі ў дзіцячых прытулках і танчылі на беларускіх культурніцкіх вечарынах... І яшчэ адзін чалавек аб'яднаў іх: Іван Дамінікавіч Луцэвіч, Янка Купала, з якім сяброўкі сустрэліся ў рэдакцыі газеты «Наша Ніва», дзе малады паэт тады працаваў.

Купала ўсю ноч у рэдакцыі чытаў Канстанцыі Буйло п'есу «Паўлінка», потым зрабіўся рэдактарам яе першай кнігі «Курганная кветка», якая выйшла ў 1914 годзе... А Уладзіслава стала яго жонкай.

Янка Купала і Уладзіслава Францаўна не адвярнуліся ад Канстанцыі, калі яе мужа ў 1933-м арыштавалі як ворага народа... А Костка падтрымлівала Уладку, калі загінуў Янка Купала, ратавала ад адчаю: «Я ведь очень хорошо знаю, что вся жизнь твоя была для него. Владочка, теперь переключи твою кипучую энергию на какую-нибудь работу для родной Белоруссии».

Менавіта Канстанцыю Буйло Уладзіслава Францаўна ў 1942 годзе просіць пад'ехаць у крэматорый, паглядзець, як там помнік Янку, даць грошы жанчыне, што за ім выглядае. Уладзіслава дапамагае сяброўцы з друкаваннем твораў і выданнем кніг — зразумела, што жонцы ворага народа многія шляхі былі перакрытыя, дваццаць гадоў яна ўвогуле не друкавалася. Уладка падказвае ў лістах, каму з літаратурных чыноўнікаў трэба выказаць павагу, у якой афіцыйнай імпрэзе абавязкова паўдзельнічаць. Клапоціцца, каб сяброўка атрымала медычную дапамогу. Вось, прыкладам, ліст ад 13 чэрвеня 1955 года на бланку літаратурнага музея Янкі Купалы, дырэктарам якога і стваральніцай стала Уладзіслава Луцэвіч:

«Дорогая моя Костка!

Твое письмо М.К. передала тов. Бровку. Он сказал, что тебе сам напишет. Я с удовольствием пойду в леч. ком., но ты должна написать, с какого времени просишь путевку и куда. Я говорила, что ты хочешь в Крым, и Нейфак говорит, что тебе лучше ехать туда».

Аднойчы ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва я знайшла цікавы дакумент — ліст з Масквы Канстанцыі Буйло ад 26 верасня 1958 года да Уладзіславы Францаўны ў Мінск:

«Милый, хороший, родной Владысик!

Только что отправила письмо, успокоенная твоим заверением, что через «пару дней ты выйдешь на работу», а вот томит меня какое-то тревожное беспокойство. Поэтому очень прошу тебя — напиши мне, как ты себя чувствуешь — не длинным письмом, — а хотя бы коротенькой открыточкой... У меня все благополучно. Только очень скорблю, что не поехала в Крым — так хочется к морю — что выразить тебе не могу. Какая-то острая тоска — похожая на ностальгию — тоску по Родине — которая приводит к серьезным психическим расстройствам... Ночью проснусь — и кажется, что за окном шумит море — а это плещется наш серый, скучный, осенний дождь. Написала стихотворение:

О старасць! Я цябе
не клікала... Не, не!
Дык што ж ты наплыла
цяжкой, сцямнелай
хмарай?
І страшыш ты мяне —
як прывід грозны —
старасць,
І безнадзейнасцю
сціскаеш сэрца мне.
Жыву я ў поўны рост!
Квітнеюць сэрца мары,
У песні я пяю аб шчасці,
аб вясне...
Нашто жа ты ідзеш?
Чаго ты хочаш, старасць?
Чаму панура так глядзіш
у вочы мне?
Прыйдзі пазней...
Прыйдзі —
як восень залатая,
Адзеўшы ў золата
і дрэвы і палі,
Прыйдзі багатая
выдатным ураджаем
Пражытых многа год —
што плён свой прыняслі.
І будзеш ты ў мяне
прыемнай і прыгожай,
Усё, што зроблена,
я сціпла падлічу,
А сэрца мне шапне —
што, калі захачу,
Змагу на многа йшчэ
здабытае умножыць...
Цяпер — яшчэ не час!
Гарыць агонь душы,
Хвалююць бурна кроў
жаданні і надзеі,
І многа важных спраў мне
трэба давяршыць,
Дык знікні! Адыдзі!
І не чапай мяне.
Сыдзі з маіх вачэй!
Сплыві па ветру хмарай...
Павер — зарана йдзеш...
Зарана — старасць!
І я цябе зусім не клікала...
Не, не!
14/IX-58

Вот видишь, какими настроениями полна я в день, когда подходит мое 60-летие».

А цяпер звернем увагу на дату — і ліст, і верш напісаныя ў верасні 1958 года. Чаму ж Канстанцыя Буйло кажа, што гэта — напярэдадні яе шасцідзесяцігоддзя, калі яе 130-годдзе мы адзначаем вось цяпер, у 2023-м? Значыць, у 1958-м паэтэсе мусіла быць ужо 65 гадоў? Неяк лічбы не супадаюць...

Давайце ж раскрыем сакрэт гэтага несупадзення.

У даведніку Саюза пісьменнікаў БССР 1970 года і ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, то-бок яшчэ пры жыцці паэтэсы, значылася, што Канстанцыя Буйло нарадзілася ў 1899 годзе. Па сведчаннях сучаснікаў, Канстанцыя спакойна візіравала гэтыя артыкулы са словамі: «Хай будзе так...»

У 1923-м мужа Канстанцыі Буйло, таленавітага агранома Віталія Калечыца, запрасіў на працу ў Маскву прафесар Тупайкаў, які загадваў Першай усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкай. Калі праз год выстаўка зачынілася, Калечыцу давялося шукаць іншую пасаду. Працаваў інспектарам у банку, нават стварыў з сябрамі арцель па выпуску анілінавых фарбаў, але НЭП доўжыўся нядоўга, з прадпрымальнікамі расправуляліся... Карацей, сямейны дабрабыт усё змяншаўся. З цягам часу давялося шукаць працу і Канстанцыі, якая дагэтуль была ў становішчы хатняй гаспадыні. У яе нават пашпарта не мелася! У 1928-м, калі спатрэбілася ўладкоўвацца на працу, давялося рабіць пашпарт. Маскоўскім пашпартыстам не было адкуль узяць дакументаў для праверкі — родны Вільна Канстанцыі знаходзіўся на тэрыторыі панскай Польшчы. І калі паэтку запыталіся, колькі ёй гадоў, яна адказала: «А колькі дадзіцё?» І не пярэчыла, калі яе «на вока» амаладзілі на шэсць гадоў.

Што ж, напэўна, у кожнай сям'і ёсць гісторыя, як бабулі і дзядулі мелі ў дакументах дату нараджэння, якая не супадала з сапраўднай. Нехта адмыслова «амаладжваўся», нехта прыпісваў себе гады...

Сапраўдную дату нараджэння паэтэсы высветліў яе сын Яўгеній Калечыц. У 1987 годзе ў гістарычным архіве Літоўскай ССР знайшоўся дакумент пра тое, што 17 студзеня 1893 года ў віленскім касцёле св. Якава «был окрещен ребенок по имени Констанция, дочь крестьян Антона и Настазии ур. Бусилов, Буйлов, родившаяся 2 января 1893 г. в г. Вильне».

Вось гэтая дата выглядае лагічна... Інакш давядзецца лічыць, што першы зборнік Канстанцыя Буйло, як вундэркінд, выдала ў 15 гадоў (так многія і лічылі да нядаўняга часу), і абвянчалася непаўналетняй... І наўрад пасябравала б яна з Уладзіславай, якая нарадзілася ў 1891-м — надта вялікая была б у дзяўчынак розніца ва ўзросце.

Але чаму ў такім выпадку ў 1958-м Канстанцыя Антонаўна ў лісце да Уладзіславы Луцэвіч піша пра сваё шасцідзесяцігоддзе, якое набліжаецца? Яна ж ведала, што ёй ужо даўно больш за шэсць дзясят... І Уладка ведала.

Ну, па-першае, афіцыйна юбілей сапраўды святкавалі на пачатку 1959-га — творчыя сустрэчы, публікацыі, віншаванні... Па-другое, чаму б жанчыне і не пагуляць, не паверыць у свае маладзейшыя гады — як яна ставілася да старасці, сведчыць прыведзены ў лісце верш.

Канстанцыя Буйло пражыла доўгае жыццё. У 1972-м, праз дванаццаць гадоў пасля смерці Уладкі, яна піша яшчэ адзін верш пра старасць:

«А старасці няма!
Ты ёй не вер,
Калі ў грудзях
жывое сэрца б'ецца,
Калі з грудзей свабодна
песня льецца,
Сум мой знікае,
як драпежны звер,
І неба, і блакіт вачэй
смяецца,—
Ты старасці
не вер!»

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.



Ліст з Масквы Канстанцыі Буйло ад 26 верасня 1958 г. да Уладзіславы Францаўны ў Мінск.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ООО «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп» в лице ликвидатора – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 30 января 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение:** Гомель, ул. Малайчука, 12			
1	**Капитальное строение с инв. № 210/С-11497**, площадью **118,00 кв. м**, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **магазин.** Составные части и принадлежности: склад. Адрес: Витебская обл., Браславский р-н, Межанский с/с, 16, вблизи д. Усяны. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **220885615401000067** общей площадью **0,0757 га (право постоянного пользования). Адрес:** Витебская обл., Браславский р-н, Межанский с/с, 16, вблизи д. Усяны. **В состав лота № 1 входят 58 единиц инвентаря и оборудования**	12 974,40	**1 297,44**
2	Станок для резки блоков Белмаш MCS-400, 2020 год выпуска, инв. № 00000025	816,00	**81,60**
3	**Автомобиль LADA 21703**, рег. № 8064 ЕН-6, 2010 год выпуска, тип ТС – легковой седан, тип двигател – бензиновый, МКПП	960,00	**96,00**
5	**Автомобиль ВАЗ 21703**, рег. № 0320 ВІ-6 (6ЕІТ4218), 2008 год выпуска, тип ТС – легковой специальный седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП	1 728,00	**172,80**
6	**Автомобиль VAZ 21713 120-01**, рег. № 9920 КЕ-3, 2011 год выпуска, тип ТС – легковой универсал, тип двигателя – бензиновый, МКПП	3 216,00	**321,60**
7	**Автомобиль VAZ 21703**, рег. № 1058 КМ-3, 2012 год выпуска, тип ТС – легковой автомобиль седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП	2 688,00	**268,80**
8	**Автомобиль VAZ 21703**, рег. № 5071 ІР-3, 2012 год выпуска, тип ТС – легковой автомобиль седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП	2 688,00	**268,80**
9	**Автомобиль FORD TRANSIT**, рег. № 6787 КІ-3 (3ТЕ 4569), 1995 год выпуска, тип ТС – легковой вагон, тип двигателя – дизельный, МКПП	1 776,00	**177,60**
11	**Автомобиль FORD TRANSIT**, рег. № 3671 ЕВ-3, 1992 год выпуска, тип ТС – легковой вагон, тип двигателя – дизельный, МКПП	1 632,00	**163,20**

Продавец: Общество с ограниченной ответственностью «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп», 246028, г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 611-98-91 – зам. директора Антон Александрович.**

Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 января 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 26 января 2023 г. в 16.00 включительно.

